*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**3** МАЯ 2008 г.
СУБОТА
№ 84
(26197)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## «МЫ ПЕРАМАГЛІ!»

Мерапрыемствы да Дня Перамогі ў Беларусі пройдуць пад адзіным лозунгам «Мы перамаглі!», паведаміў БЕЛТА першы сакратар ЦК БРСМ Леанід Кавалёў. Ва ўсіх рэгіёнах Беларусі напярэдадні Дня Перамогі актывісты БРСМ будуць раздаваць значкі з атрыбутыкай свята і стужкамі маладзёжнай арганізацыі. «Калі ты патрыёт роднай Беларусі, ведаеш і цэніш гераічныя подзвігі сваіх бацькоў і дзядоў, шануеш памяць аб загінулых за незалежнасць Айчыны, то ў гэтыя майскія дні абавязкова прымацуй на адзенне, павязы на руку, на сумку або антэну аўтамабіля сімвал акцыі — стужка з выявай Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь і выявай Георгіеўскай стужкі», — заклікаў Леанід Кавалёў. БРСМ таксама арганізуе работу тэматычных маладзёжных агітпляцовак, правядзенне канцэртных праграм для ветэранаў і моладзі, святаў вуліц, названых імёнамі Герояў Вялікай Айчыннай вайны. Абавязкова будуць арганізаваны сустрэчы пакаленняў «Слава героям», «Раўненне на героя Перамогі». Моладзь зойме удзел у добраўпарадкаванні помнікаў, воінскіх пахаванняў, акажа шэфскую дапамогу ветэранам вайны і працы. Леанід Кавалёў паведаміў таксама, што за тэрытарыяльнымі камітэтамі БРСМ замацавана звыш 5 тыс. помнікаў і мемарыяльных воінскай славы. На іх рэканструкцыю і добраўпарадкаванне накіроўваюцца сродкі, заробленыя актывістамі рэспубліканскага саюза моладзі на суботніках, падчас працоўных акцый і мерапрыемстваў. Пры БРСМ створаны 153 ваенна-патрыятычныя клубы «Памяць».

## МІНСК РЫХТУЕЦЦА ДА ДНЯ ПЕРАМОГІ

Ужо ўпрыгожаны і добраўпарадкаваны месцы ў цэнтры сталіцы, дзе адбудуцца культурна-масавыя мерапрыемствы. Дарэчы, у сувязі з рэпетыцыямі святочнага шэсця 3, 7 і 8 мая з 22 да 24 гадзін будзе абмежаваны рух па праспекце Незалежнасці ад вуліцы Энгельса да вуліцы Казлова. 9 мая рух па праспекце Незалежнасці будзе абмежаваны з 11 да 13.30 гадзін ад вуліцы Гарадскі вал да Казлова.

Мерапрыемствы, прысвечаныя Дню Перамогі, пачынаюцца ў нашай краіне ўжо сёння. «3 мая ў 120-й механізаванай брыгадзе пройдзе канферэнцыя з удзелам міністра абароны, паўсюль у краіне арганізаваны святочныя мітынгі і сустрэчы з ветэранамі, ушанаванне герояў, ускладанне вянкоў і гірляндаў да брацкіх магіл», — паведаміў начальнік прэс-службы Міністэрства абароны палкоўнік Вячаслаў Раменчык. 7 мая ў Нацыянальнай бібліятэцы будзе праведзена акцыя «Армія і культура». 8 мая а 17-й гадзіне ў вялікай зале Палаца Рэспублікі — святочны канцэрт майстроў мастацтва. Акрамя таго, у Беларусі адкрываецца пошукавы сезон: воіны 52-га пошукавага спецыялізаванага батальёна будуць шукаць рэшткі салдатаў Другой сусветнай вайны ў 46 раёнах нашай краіны. На сёння існуе ўжо каля 6 тысяч пахаванняў і іх колькасць штогод павялічваецца.

Па традыцыі святочную праграму Дня Перамогі адкрые шэсце ветэранаў (пачатак а 12-й гадзіне) ад Кастрычніцкай плошчы да плошчы Перамогі, якое завершыцца ўскладаннем вянкоў да абеліска Перамогі. «Плануецца, што ў шэсці возьме ўдзел як мінімум 6 тысяч чалавек. Улічваючы сталы ўзрост нашых ветэранаў, мы вырашылі ўпершыню прадаставіць ім у карыстанне 12 «уазікаў». Так што ў час шэсця яго ўдзельнікі могуць ехаць ва ўпрыгожаных аўто, да праспекта ж Незалежнасці ветэраны будуць дастаўлены на аўтобусах», — праінфармаваў ваенны камендант мінскай ваеннай камендатуры палкоўнік Анатоль Грыцаў. Што ж датычыцца самага доўгачаканага элемента святочнай праграмы Дня Перамогі — салюта, то па традыцыі ён адбудзецца а 22-й гадзіне ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі і сталіцы. Палкоўнік Грыцаў удакладніў, што «сёлета салюта ў сталіцы не будзе ў раёне Медуніверсітэта ў сувязі з інтэнсіўным будаўніцтвам метро, якое там вядзецца». У Мінску салют адбудзецца ў шасці пунктах горада: ля стэлы «Мінск — горад-герой», у раёне вуліц Матусевіча, Гарэцкага і Панамарэнкі, у парку 900-годдзя Мінска, у ваенным гарадку ва Уруччы і ля Нацыянальнай бібліятэкі. Салют будзе працягвацца 10 хвілін. За гэты час будзе дадзена 30 залпаў.

Паводле слоў начальніка ўпраўлення ідэалагічнай работы Мінгарвыканкама Генадзя Курбекі, у святочныя дні ўлады не будуць забараняць прадаваць алкаголь у гандлёвых пунктах сталіцы, бо «патрэбна прывіваць людзям культуру піцця».

**Ірына ПРЫМАК.**

## Новабудоўля ў Харомску



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фотаздымак зроблены гэтымі днямі ў вёсцы Харомск Столінскага раёна — малады бусел будзе сваё гняздо на вільчыку вясковай новабудоўлі.

## У БАРБАРОВЕ НАД ПРЫПЯЦЦЮ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***Старшыня Барбароўскага сельскага Савета Мазырскага раёна Галіна ДЗЯРКАЧ і жыхары вёскі Пётр СУШЧЫК і Сяргей ЛІС паднаўляюць помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў Вялікай Айчыннай вайны, якая знаходзіцца ў цэнтры вёскі Барбароў.***

## «ДЗЯКУЙ ЗА ЖЫЦЦЁ»

Больш за 545 тыс. піянераў і акцябрат акажуць дапамогу ветэранам падчас рэспубліканскай акцыі «Дзякуй за жыццё».

Як расказала карэспандэнту БЕЛТА старшыня Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі Наталля Абравец, піянеры і акцябраты маюць намер ахапіць увагай усіх ветэранаў. Яны акажуць пажылым людзям дапамогу ў добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый, дапамогуць прыбраць кватэры і дамы, дзе пражываюць героі Вялікай Айчыннай вайны, упрыгожаць дамы ветэранаў атрыбутыкай цімураўскага руху. Таксама падрыхтаваны канцэрты, творчыя нумары мастацкай самадзейнасці.

### ГРАФІК ВЫПЛАТЫ ПЕНСІЙ ЗМЕНЕНЫ Ў СУВЯЗІ СА СВЯТАМІ

Выплаты будуць праведзены на 1—3 дні раней, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў РУП «Белпошта». Выплата пенсій з першага дня месяца ажыццяўляецца толькі ў горадзе Мінску і Віцебскай вобласці (у астатніх рэгіёнах — з пятага дня месяца). Мінскія і віцебскія пенсіянеры атрымалі пенсію за 1 мая ўжо 30 красавіка. З 3 мая (для большасці паштовых аддзяленняў гэта рабочы дзень) пачнецца выплата пенсій за 6 мая, а з 7 чысла пенсіянеры будуць атрымліваць пенсіі за 9 мая. Паколькі 10 мая паштовыя аддзяленні, у асноўным, будуць працаваць, то ў гэты дзень будуць праведзены пенсіённыя выплаты за 11 мая.

### ХРЭСНЫ ХОД УЗДОЎЖ ДЗЯРЖМЯЖЫ

Беларускія памежнікі атрымаюць магчымасць не пакідаючы месца службы ўбачыць знакаміты абраз Жыровіцкай Божай Маці.

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, хрэсны ход пачнецца сёння ў Гродне. Потым абраз здзейсніць урачыстае падарожжа амаль па ўсім перыметры нашай мяжы з Польшчай, Літвой, Латвіяй, Украінай і 14 мая вернецца дамоў, у Жыровіцкі манастыр. У прэс-цэнтры ДПК падкрэслілі, што хрэсны ход прымеркаваны да 90-годдзя ўтварэння пагранічнай варты Беларусі. Гэты юбілей нашы памежнікі будуць адзначаць 28 мая.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### ЗАКУПАЧНЫЯ ЦЭНЫ НА СЕЛЬГАСПРАДУКЦЫЮ ЎРАДЖАЮ 2008 ГОДА ДЛЯ ПАСТАЎКІ ПА ДЗЯРЖЗАКАЗУ ПАВЯЛІЧАНЫ НА 35 ПРАЦЭНТАЎ

Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў №613.

ISSN 1990 - 763X

## МЕХАНІЗМУ АКАЗАННЯ АДРАСНАЙ САЦЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОГІ ПАТРЭБНЫ ПЕРЫЯД АДАПТАЦЫІ

**Абноўленаму механізму аказання адраснай сацыяльнай дапамогі патрэбны перыяд адаптацыі, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Пяткевіч. Яна прыняла ўдзел у адкрыцці новага будынка раённага суда ў г.п. Акцябрскі (Гомельская вобласць).**

У Беларусі ўкаранёны абноўлены механізм аказання адраснай сацыяльнай дапамогі, які павінен замяніць сістэму льгот, якая дзейнічала раней. З мэтай вывучэння сітуацыі па аказанні адраснай сацдапамогі Адміністрацыя Прэзідэнта праводзіць пастаянны маніторынг у гэтай сферы: вывучаюцца праблемныя пытанні, абмяркоўваецца, дзе і каму патрэбна метадалагічная або фінансавая дапамога, і іншае. «Па выніках такой работы ў першым квартале мы прыйшлі да высновы, што праблем, якія патрабуюць прававога ўдасканалення новага механізма аказання адраснай сацдапамогі, не выяўлена. А пытанні, якія датычацца, напрыклад, неразумення, няправільнага тлумачэння або прымянення, былі абмеркаваны на рэспубліканскім семінары і аператыўна ліквідаваны», — адзначыла Наталля Пяткевіч.

На яе думку, асноўным пытаннем у механізме аказання адраснай сацыяльнай дапамогі на гэты момант застаецца фінансаванне. «Зразумела, што аб'ём грашовых сродкаў на аказанне адраснай сацыяльнай дапамогі вызначаўся зыходзячы з папярэдніх падлікаў. Сёння атрымалася, што тых, хто хадайнічае аб аказанні такой дапамогі, у тры разы больш, чым прагназавалася. Але нягледзячы на гэта, грашовыя сродкі на гэтыя мэты будуць выдзяляцца аператыўна», — запэўніла Наталля Пяткевіч.

## Зона адчужэння Гомельскай вобласці будзе адкрыта для наведвання

У гэтым годзе наведаць месцы пахаванняў, што размешчаны ў зоне радыяцыйнага адчужэння і адсялення на тэрыторыі Гомельскай вобласці, можна будзе на працягу трох дзён — з 4 па 6 мая. У гэты час уезд на тэрыторыі радыяцыйнага кантролю будзе ажыццяўляцца без спецыяльных пропускаў.

Як паведаміў начальнік упраўлення аховы правапарадку УУС Гомельскага аблвыканкама Юрый Селіванаў, людзям, якія накіроўваюцца на могілкі ў адселеныя вёскі, неабходна мець пры сабе дакументы, якія засведчваюць асобу. На кантрольна-прапускных пунктах будуць фіксавацца даныя тых, хто ўязджае.

Паводле слоў Юрыя Селіванава, штогод да больш чым 230 месцаў пахаванняў прыязджае звыш паўсотні тысяч чалавек. У гэтыя дні асаблівую актуальнасць набывае выкананне правілаў пажарнай бяспекі, на што і звяртаюць увагу наведвальнікаў супрацоўнікі праваахоўных органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях.

**Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**
**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже бетонно-растворного узла (общ. пл. 706 кв.м) и устройства для выгрузки цемента, расположенных: г. Борисов, ул. Демина, 13. Площадь земельного участка – 0,2341 га. Начальная цена снижена на 50 % и составляет 81 000 000 бел. руб с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.02.2008 г. **Аукцион состоится 13.05.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 12.05.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 2246134.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**
**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенного в доход государства гаража общ. пл. 520,4 кв.м, расположенного: Борисовский р-н, д. Углы. Начальная цена — 148 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.02.2008 г. **Аукцион состоится 21.05.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 20.05.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны (8017) 2246134, (80177) 739327.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

Вниманию акционеров
**ОАО «Белгорхимпром»!**

**Внеочередное общее собрание состоится 12 мая 2008 года в 13.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об утверждении Положения о порядке направления в служебные командировки за границу и распространении его действия на расходы, произведенные с 01.01.2008 г.

**Регистрация акционеров с 10.00 до 12.30.**

УНП 600024712

## ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ РАДАЎНІЦА



— Раджджаство Хрыстова заўсёды святкуецца ў адзін і той жа дзень — 7 студзеня, — даводзіла мне некалі ў дзяцінстве пра асаблівасці рэлігійных святаў мама. — А вось Вялікдзень чысла не глядзіць. І Радаўніца таксама...

Тады мама яшчэ не ведала, што і ў яе, і ў мяне, і ў тысяч іншых людзей пасля 1986 года з'явіцца свая Радаўніца, якая будзе «глядзець чысло» і адзначацца заўсёды ў адзін і той жа дзень: 26 красавіка.

На Радаўніцу кожны ідзе-едзе-спяшаецца да дарагіх магіл. Каб пастаяць ля сціплага крыжа ці дыхтоўнага помніка, памянуць добрым словам і традыцыйнай у гэты дзень чаркай бацькоў, дзядоў, родных, сяброў, проста добрых людзей, якія былі калісьці побач.

26 красавіка таксама памінаюць. Тыя, для каго слова «чарнобылец» стала крутым зломам жыцця. Сваю радзіму, засыпаную чарнобыльскім попелам. Родную вёску-нябожчыцу, што засталася за калючым дротам. Бярозку ля ганка, з якой няма каму спускаць вясною сок. Сяброў-аднавяскоўцаў, якія не дажылі. Колішняе «даваеннае», дачарнобыльскае жыццё.

Дзе і як — тое кожны з чарнобыльскіх перасяленцаў, якіх раскідала па ўсёй Беларусі, вырашае сам. Бо пакуль што няма такога месца, куды б можна — і трэба было — у гэты дзень прыехаць. Да сваёй пакінутай хаты? Там жывуць цяпер чужыя людзі. У сваю вёску? Туды, у зону адчужэння, так проста не даедзеш...

...У 1991 годзе жыхары пацярпелых ад аварыі раёнаў, якіх хваля перасялення закінула ў Маладзечанскі раён, 15 мужчын, сабраліся ў гэты дзень паміж вёскамі Лебедзева і Насілава, у закінутым садзе на мяжы двух калгасаў, якія на той час узначальвалі перасяленцы: Пётр Андрэевіч Атрошчанка і Павел Паўлавіч Бычкевіч. Пасядзелі-пагаманілі-паўспаміналі. Як водзіцца, узялі па чарцы. І вырашылі: 26 красавіка, на чарнобыльскую Радаўніцу, штогод будзем збірацца тут! Што б ні здарылася і якія клопаты ні перашкаджалі б, гэты дзень — святы. А яшчэ вырашылі, што месца гэтае трэба зрабіць памятным. Нават не для сябе — ім той дзень, як і сваю маленькую радзіму, і так да скону не забыць. А для сваіх — ды і чужых — дзяцей. Каб помнілі...

Тут кантроль ніхто ні на кога не ўскладваў. Проста ўсе ўсведамлялі розумам і сэрцам: так трэба. І неўзабаве на месцы традыцыйных збораў чарнобыльскіх перасяленцаў узнёсся высачэнны — здаецца, што аблачынка, зачапіўшыся за верх, згледзіць абрысы пакінутай радзімы — крыж. Са сціплай таблічкай: «Крыжовае знаменне ў гонар усіх смуткуючых радасці. Узведзена сіламі вернікаў, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС». Яго асвяціў айцец Уладзімір Кудрэвіч, настаяцель Свята-Пакроўскага храма, які, дарэчы, з таго часу на чарнобыльскую Радаўніцу таксама штогод тут: служыць малебен за ахвяраў катастрофы.

А неўзабаве побач з крыжом паўстаў і сімвалічны памятны знак. Вялізны камень адшукаў Міхаіл Марцюхоў. Устанавілі яго таксама землякі. А потым ужо, як гэта часта бывае, да грамадскай ініцыятывы, каардынатарам і галоўнай рухаючай сілай якой з'яўляецца нястомны Анатоль Керус, падключыліся афіцыйныя ўлады: калі адзначалася 20-годдзе аварыі на ЧАЭС, камень быў пераўтвораны ў памятны знак, тут адбыўся мітынг-рэквіем, у гонар сумнай даты перасяленцы пасадзілі сквер...

...Цяпер тут 26 красавіка збіраюцца не толькі жыхары бліжэйшых вёсак, але і перасяленцы з усяго Маладзечанскага раёна. Ды і не толькі Маладзечанскага: са Смаргоні, Астраўца, Мінска. Аляксандр Лягун, адзін з пачынальнікаў традыцыі, дзеля гэтай сустрэчы штогод спецыяльна прыязджае за сотні кіламетраў з Гродна. «Хто ты, што ты?» — тут не пытаюць. Пропускам служыць «Прывітанне, землякі!» Ды своеасаблівы паляшуцкі говар, ды шчырая адкрытая ўсмешка. Таму і збіраюцца тут усе: хойніцкія і брагінскія, буда-кашалёўскія і добрушскія, калінкавіцкія і нараўлянскія. Тыя, хто апынуўся ўдалечыні ад роднай зямлі пасля аварыі і хто прыехаў сюды задоўга да яе.

Мне здаецца, што гэтыя энтузіясты на чале з Анатолем Керусам самі да канца не ўсвядомілі, які незвычайны па сіле сімвалічны знак стварылі. У Хатыні ёсць помнік спаленым фашыстамі вёскам. У Хойніках устаноўлены помнік вёскам, што загінулі пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Туды можна прыехаць на чарнобыльскую Радаўніцу, пастаяць, памаліцца.

А яшчэ адно месца для чарнобыльскай памінальнай малітвы, для сустрэчы землякоў узнікла ў Маладзечанскім раёне, ля вёскі Лебедзева. І з кожным годам тут збіраецца ўсё больш людзей. І з кожным разам над збуцвелым садам усё гучней звініць песня, якую тутэйшыя перасяленцы лічаць сваім своеасаблівым гімнам. Надрыўна, скрозь слёзы, у некалькі дзесяткаў галасоў: «Дзе б вы ні былі, дзе б вы ні жылі, вы вяртайцесь дамоў па вясне. Гусі-лебедзі, гусі-лебедзі, няма шчасця ў чужой старане»...

**Ніна РЫБІК.**

**САРДЭЧНА ВІНШУЮ КАЛЕКТЫЎ РЭДАКЦЫІ «ЗВЯЗДЫ» З НАСТУПАЮЧЫМ ПРАФЕСІЙНЫМ СВЯТАМ ДНЁМ ДРУКУ**

*Ушаноўваючы важную ролю газеты ў аб'ектыўным адлюстраванні грамадска-палітычнага жыцця ў нашай дзяржаве, хацеў бы асабліва адзначыць значны ўклад выдання ў інфармаванне сваіх чытачоў аб дзейнасці Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і прынятых парламентам законах.*

*Жадаю журналістам і ўсім работнікам рэдакцыі моцнага здароўя, дабрабыту і новых творчых поспехаў у імя росквіту Беларусі.*

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь В.А. ПАПОЎ.**

## 7 МАЯ — ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ РАДЫЁ, ТЭЛЕБАЧАННЯ І СУВЯЗІ

Чытайце на 8-й стар. матэрыял пра дзейнасць ААТ «Белсувязьбуд».

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ — ЗАМАРАЗКІ?

**Сёння ўдзень чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідрапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў. Тэмпература паветра — 15—20 градусаў цяпла.**

У нядзелю невялікія дажджы будуць назірацца толькі па паўднёвым захадзе краіны. Тэмпература паветра ўначы 4—10, удзень 15—20 цяпла. У панядзелак будзе сонечна. У аўторак чакаецца без ападкаў, але па ўсходзе і 7 мая па поўначы краіны пройдуць невялікія дажджы. 6 і 7 мая пахаладае. Тэмпература паветра ўначы 2—8 градусаў цяпла, па нізінах замаразкі да 0—мінус 2 градусаў, удзень 12—19 цяпла. Сапраўднае цяпло завітае ў Беларусь у другой палове мая.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### РЭКЛАМНАЯ АФЕРА НА «БЕЛМЕДПРЭПАРАТАХ»

**Вынесены прысуд былому намесніку дырэктара РУП «Белмедпрэпараты» і шэрагу кіруючых работнікаў бухгалтэрыі прадпрыемства.**

Як паведаміла оперупаўнаважаны па асабліва важных справах галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі МУС краіны Вераніка Пасьмеццева, намеснік дырэктара памянёнага прадпрыемства разам з галоўбухам, кіраўніком паналічэнні заробку, двума касірамі і індывідуальным прадпрымальнікам на працягу 2002—2006 гадоў займаліся рэкламнымі аферамі. У прыватнасці, яны заключалі фіктыўныя дамовы з фізічнымі асобамі на рэкламу лекавых сродкаў у Расіі і ва Украіне. Насамрэч, ніякай рэкламы не праводзілася. А выдзеленыя на гэтыя мэты грошы клалі ў сваю кішэню памянёныя асобы. Усяго за 4 гады такой «рэкламнай дзейнасці» яны прысвоілі амаль 700 мільёнаў беларускіх рублёў. Днямі ў судзе Маскоўскага раёна завяршыўся працэс над аферыстамі. Былы намеснік дырэктара і галоўны бухгалтар «Белмедпрэпаратаў» атрымалі па дзевяць з паловай гадоў пазбаўлення волі, іх колішнія падначаленыя — ад 5 да 6 гадоў пазбаўлення волі.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### ЛІКВІДАВАНЫ «ФАЛЬШЫВАМАНЕТНЫ ДВОР»

**У Барысаве двое хлопцаў і дзяўчына спрабавалі разлічыцца за праезд у «маршрутцы» падробленай купюрай.**

Паводле звестак УУС Мінаблвыканкама, вадзіцель мікрааўтобуса фальшыўку выявіў, але затрымаць зламыснікаў не здолеў. Праўда, запомніў іх прыметы і паведаміў у міліцыю. Праз некалькі гадзін праваахоўнікі арыштавалі ўсю тройцу. Падчас вобыску на іх кватэрах былі знойдзены падробленыя купюры вартасцю 50 тысяч, 20 тысяч, 10 тысяч і 500 беларускіх рублёў. Тут жа захоўваліся і прылады працы фальшываманетчыкаў: сістэмны блок і фотапрынтар, а таксама іншая камп'ютарная тэхніка. Міліцыя ўстанавіла, што за мінулы месяц гэты «фальшываманетны двор» выпусціў не менш як 19 падробленых купюр беларускіх грошай.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**



Фота-слова. Яўгена ПЯСЕЦКАГА

*Усіх Дзядоў, хто жыў ў даўнейшай грамадзе,*
*Хто веры не змяніў і праўды не парушыў —*
*Прашу, каб Край павек не чэзнуў у бядзе,*
*Маліцеся за нас, мацуйце нашы душы.*
*Маліцеся, каб нам збыліся вашы сны*
*Пра шчодрыя палі і вольныя абшары,*
*Каб матчынай слязы не бачылі сыны,*
*Каб бацькаву раллю не зачарнілі хмары.*
*Каб ад дзявочых слёз ніколі не шарэў*
*Валошкамі уквечаны абрус,*
*Каб ранкам веснавым жаўрук не анямеў —*
*Маліцеся за нашу Беларусь.*

# Смаргонскі раён і горад Гродна занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 239 «Аб занясенні на Рэспубліканскую дошку Гонару пераможцаў спаборніцтва 2007 года».**

У адпаведнасці з дакументам пераможцы ў спаборніцтве за дасягненне найлепшых вынікаў у выкананні асноўных мэтавых паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару, адкрыццё якой адбылося 30 красавіка, напярэдадні Свята працы.

Па выніках спаборніцтва першыя месцы занялі: сярод раёнаў — Смаргонскі раён, сярод гарадоў і раёнаў у гарадах — Гродна; сярод прамысловых арганізацый і арганізацый паліўна-энергетычнага комплексу — ААТ «Мінскі камбінат сілікатных вырабаў», ААТ «Шклоўскі масларобны завод», прыватнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Пастаўскі мэблевы цэнтр».

Пераможцамі прызнаны: сярод будаўнічых арганізацый — дзяржаўнае вытворчае аб'яднанне «Мінскбуд», сярод арганізацый сувязі — Магілёўскі філіял рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства электрасувязі «Белтэлекам», сярод арганізацый транспарту — ААТ «Бабруйскі грузавы аўтамабільны парк № 1», сярод арганізацый сферы паслуг — камунальнае гандлёва-вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Універмаг «Слуцк» і камунальнае гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Гандальсэрвіс» (Рэчыцкі раён).

Сярод арганізацый аграпрамысловага комплексу пераможцамі сталі ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі» (Дзяржынскі раён) і сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Кастрычнік-Гродна» (Гродзенскі раён); сярод арганізацый навукі і навуковага абслугоўвання — установа Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта «Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Частка амерыканскіх дыпламатаў пакіне Мінск

30 красавіка ў МЗС, як паведаміла прэс-служба Міністэрства замежных спраў, быў запрошаны часовы павераны ў справах ЗША ў Беларусі Джонатан Мур. Яго праінфармавалі аб тым, што на дзень гэтай сустрэчы штат супрацоўнікаў беларускага пасольства ў Вашынгтоне (аб гэтым было загадзя паведамлена амерыканскаму боку) скарочаны да 6 чалавек.

Дж. Муру таксама была ўручана нота МЗС і перададзены спіс амерыканскіх дыпламатаў, якія былі аб'яўлены персонамі non grata і павінны пакінуць тэрыторыю Беларусі.

1 мая ў МЗС адбылася чарговая сустрэча з Дж. Мурам. Нагодай стала адмова амерыканскага боку прытрымлівацца рэкамендацыі МЗС аб аналагічным скарачэнні колькасці супрацоўнікаў пасольства ЗША ў Мінску. Дж. Мур пацвердзіў, што асобы, якія аб'яўлены персонамі non grata, пакінуць нашу краіну ва ўстаноўленыя тэрміны.

Гэтым рабочым момантам дыпламатычных адносінаў асобныя СМІ надалі сенсацыйна-скандальную афарбоўку. Напрыклад, 1 мая адзін расійскі тэлеканал са спасылкай на нейкую крыніцу паведаміў, што закрываецца амерыканскае пасольства ў Мінску, а ў Вашынгтоне — беларускае, а ў Нью-Йорку закрыецца консульства Беларусі. У прэс-службе МЗС учора днём нам паведамілі, што пакуль аніякіх дакументаў з дзярждэпартамента на гэты конт не паступала. Хутчэй за ўсё, асобныя журналісты паспяшаліся з «навіной» і выдалі ў свет неправераныя чыесьці здагадкі і меркаванні.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# ЦЯЖКАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ БЕЛАРУСІ + ІЗРАІЛЬСКІ ХАЙ-ТЭК

**Такое «ідэальнае спалучэнне» прапанаваў пасол Ізраіля ў Беларусі**

Напярэдадні 60-годдзя незалежнасці Ізраіля **пасол** гэтай краіны **Зееў Бен-Ар'е** сустрэўся з журналістамі.

Даўнія і трывалыя сувязі жыхароў дзвюх краін — сяброўскія і сваяцкія. А летась назіралася прыкметнае ажыўленне турысцкай зацікаўленасці ізраільцян у Беларусі, ды і нашы грамадзяне сталі ахвотней наведваць Ізраіль. На думку пасла, для беларусаў Ізраіль ужо не такі дарагі, як раней. Да таго ж, там няма моўнага бар'еру ды і ў плане бяспекі людзі зразумелі, што не такі страшны чорт, як яго малююць. Не без гонару прыводзім вам словы спадара Бен-Ар'е пра прыроду нашага краю: «Я вельмі люблю беларускія рэкі, азёры, палі і лясы і хачу, каб больш ізраільскіх турыстаў прыязджала сюды. Аднак не ўсе ізраільскія турысты такія непераборлівыя, як я, — ім патрэбна добрая інфраструктура, і каб нядорага было». Што ж, турызм у нас развіваецца імкліва, таму ўсё наперадзе!

— Тавараабмен паміж Беларуссю і Ізраілем расце, — адзначыў пасол. — Летась ён склаў каля 20 мільёнаў долараў. Павелічэнне тут за год больш як на 20 працэнтаў. Пры гэтым беларускія пастаўкі ў Ізраіль значна пераўзыходзяць экспарт з Ізраіля — недзе ў восем разоў, — адзначыў пасол. — Аб'ёмы тавараабмену па-ранейшаму недастатковыя, аднак тэндэнцыя да павелічэння відавочная, мы пастараемся зрабіць усё, каб гэта тэндэнцыя ўмацоўвалася і надалей. Нашы дзяржавы маглі б практычна ідэальна дапаўняць адна адну. Калі Беларусь, скажам, — база для цяжкай прамысловасці, то ў Ізраілі яе вельмі мала. Цяжкая прамысловасць мае патрэбу ў, як я кажу, яўрэйскіх камп'ютарных «штучках». А ў Ізраілі, наадварот, «штучкі» ёсць, аднак не заўсёды знойдзецца, куды іх ставіць. Таму злучэнне цяжкай прамысловасці Беларусі з ізраільскім хай-тэкам уяўляецца ідэальным.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## НА РАДЗІМЕ ХАКЕЯ

Сёння ў Квебеку хакеісты нацыянальнай зборнай Беларусі праводуць свой першы матч на 72-м чэмпіянаце свету. Супернікамі нашай каманды стануць моцныя і тытулаваныя ігракі Швецыі. У складзе беларусаў праз тры гады перапынку з'явіўся адзін з лепшых нападаючых расійскай прэм'ер-лігі Аляксей Калюжны, таксама да каманды павінен далучыцца абаронца НХЛ Руслан Салей. Упершыню на чэмпіянаце свету сустрэчы абслугоўваюць ажно чатыры беларускія суддзі — 2 рэферы і 2 лайнсмены.

## РАСІЯНЕ ЕДУЦЬ У МАНЧЭСТАР, АНГЛІЧАНЕ — У МАСКВУ

Піцерскі «Зеніт» можа паўтарыць дасягненне маскоўскага ЦСКА трохгадовай даўніны, калі армейцы сталі ўладальнікамі Кубка УЕФА. У фінале клубнага розыгрышу другога па значнасці футбольнага трафея Еўропы чэмпіёны Расіі сустрэнуцца з ігракамі шатландскага «Рэйнджэрс». Вырашальны паядынак адбудзецца 14 мая ў Манчэстары.

Нагадаем вынікі паўфіналаў: у матчы ў адказ «Зеніт» разграміў на сваім полі мюнхенскую «Баварыю» — 4:0 (вынік першай гульні 1:1), а «Рэйнджэрс» змог перамагчы італьянскую «Фіярэнціну» толькі ў серыі пенальці — 4:2 (вынік сустрэчы ў Глазга 0:0). У фінал Лігі чэмпіёнаў (пройдзе ў Маскве 21 мая) прабіліся прадстаўнікі прэм'ер-лігі «Манчэстар Юнайтэд» і «Чэлсі». «МЮ» не пусціў у галоўны матч Лігі чэмпіёнаў іспанскую «Барселону» (0:0, 1:0), а «арыстакраты» — «Ліверпуль» (1:1, 3:2).

## ГАРНЯКІ ЦІ ТРАКТАРАЗАВОДЦЫ?

18 мая на мінскім стадыёне «Дынама» тытул уладальнікаў Кубка Беларусі па футболе разыграюць сталічны МТЗ-РІПА і салігорскі «Шахцёр». Трактаразаводцы двойчы перамаглі барысаўскі БАТЭ — 2:1 дома і 4:2 у гасцях, а гарнякі выйгралі ў мінскага «Дынама» — 3:2 на выездзе, 1:0 на сваім полі.

## Абзац

■ Цэны на пасажырскія білеты на цягнікі накірункам у Расійскую Федэрацыю 9 і 10 мая будуць зніжаныя да 50 працэнтаў. Так, кошт паездкі па маршруце Мінск—Масква будзе складаць ад Br40 тыс. у плацкартным вагоне і ад Br70 тыс. у купэйным. Цэны на пасажырскія білеты зменшаныя ў сувязі з Днём Перамогі.

■ **Цэлыя суткі правёў у падвале прыватнага дома злачынцы 60-гадовы пенсіянер, жыхар Віцебскага раёна. У яго беспрацоўны — гаспадар дома — патрабаваў 35 мільёнаў рублёў, якія той атрымаў ад продажу кватэры. 47-гадовы беспрацоўны звязаў сваю ахвяру скотчам, закрыў у падвале, біў і катаваў. На месцы ўчынення злачынства яго затрымалі міліцыянеры, а пенсіянера шпіталізавалі ў Віцебскую абласную клінічную бальніцу. На яго целе разам з пабоямі медыкі знайшлі і тэрмічныя апёкі.**

■ У пасёлку Лясны Мінскага раёна невядомы зламыснік абрабаваў бальніцу. Паводле звестак УУС Мінаблвыканкама, злодзей вынес з прыёмнага пакоя электракардыёграф коштам 4 мільёны 254 тысячы рублёў. Цікава, што будзе рабіць злачынца з гэтай прыладай?

■ **Два выпадкі атручэння, як мяркуецца, смарчкамі, зафіксаваныя ў Віцебскім раёне. Аб дакладнай прычыне атручэння пацыентаў, якія знаходзяцца ў таксікалагічным аддзяленні бальніцы, урачы змогуць сказаць толькі праз два тыдні. Папярэдні дыягназ — атручэнне першымі вясновымі грыбамі. Спецыялісты заклікаюць быць вельмі асцярожнымі з дарункамі прыроды — ні адзін далікатэс не варты таго, каб рызыкаваць здароўем, падкрэсліваюць яны.**

■ Паркоўка аўтамабіляў у межах першага гарадскога транспартнага кальца Мінска ў бліжэйшыя тры гады будзе платнай, паведаміў на прэс-канферэнцыі галоўны інжынер УП «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі» Пётр Пруднікаў. Сёння ў межах першага кальца можна размясціць толькі 3,3 тыс. транспартных сродкаў пры патрэбнасці 15—17 тыс., адзначыў ён. У перспектыве колькасць машынамесцаў у цэнтры мяркуецца павялічыць да 10 тыс.

■ **Улады Егіпта ўчора закрылі тры турыстычныя фірмы ў сувязі з гібеллю турыстаў у ДТЗ. Раніцай 1 мая на трасе Шарм-эль-Шэйх — Каір перавярнуўся і загарэўся аўтобус, у якім знаходзіліся 40 турыстаў з розных краін. У выніку загінулі шасцёра расіян, украінец, румын, а таксама вадзіцель аўтобуса. Яшчэ 29 турыстаў, паліцэйскі і гід атрымалі раненні.**

■ Вучань сярэдняй школы ў амерыканскай школе, у штаце Нябраска, атрымаў раненне ў рот выпадковай куляй, калі гуляў у футбол пасля заняткаў. Хлопчык быў тэрмінова шпіталізаваны. Адразу пасля стрэлу ўсе вучні школы былі сабраныя ў будынку, пускалі туды толькі паліцэйскіх. Апошнія зрабілі заключэнне: характар пашкоджанняў (прабітыя вусны) сведчаць, што стрэл быў здзейснены здалёку і куля проста падала, уваліўшыся ў рот хлопчыку.

## Поўны абзац

■ **Кіраўнік муніцыпалітэта, які размешчаны непадалёк ад сталіцы Чылі Сант'яга, прапанаваў бясплатна забяспечваць мужчын старэй за 60 гадоў сродкамі для паляпшэння патэнцыі. Паводле яго меркавання, свабодны доступ да віягры дазволіць палепшыць якасць жыцця пажылых людзей. У мінулым мэр быў урачом, і людзі часта скардзіліся яму на беднае сэксуальнае жыццё. З дазволу падаткаплацельшчыкаў, мэр мяркуе раздаваць віягру ўсім, хто мае ў гэтым патрэбу, чатыры разы ў месяц.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ВЕЛІКОДНАЕ ПАХМЕЛЛЕ

**За «постсвяточныя» суткі на дарогах Беларусі затрымана амаль у 2 разы больш нецвярозых вадзіцеляў, чым звычайна.**

Так, паводле звестак упраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны, за памянёны перыяд выяўлена 248 п'яных асобаў, якія кіравалі транспартнымі сродкамі. Як падкрэслілі ў ДАІ, гэта своеасаблівы «сумны рэкорд», бо звычайна ў будзень за рулём затрымліваюць 130—160 выпівохаў. Менавіта па іх віне нярэдка адбываюцца дарожна-транспартныя здарэнні. За мінулыя суткі зафіксавана 27 ДТЗ, у выніку якіх 7 чалавек загінулі і 29 — паранены.

## НЕНАДЗЕЙНАЯ СХОВАНКА

**Невядомы злодзей украў у непрацуючага жыхара сталіцы 30 тысяч долараў.**

Паводле звестак упраўлення ўнутраных спраў Мінскага аблвыканкама, пацярпелы захоўваў такую вялізную суму грошай у сваёй хаце ў вёсцы Зялёны Луг, што паблізу сталіцы. Злачынца трапіў у жыллё праз акно. Адметна, што злодзей не пагрэбаваў таксама і адзеннем, а яшчэ прыхапіў 500 м электрычнага кабелю.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## «У МАІМ ДОМЕ БОМБА»

Ноччу 1 мая невядомы патэлефанаваў у міліцыю і заявіў, што ў доме па вул. Вулькаўскай, што ў Брэсце, закладзена бомба. Аператыўная група выехала па ўказаным адрасе, але бомбы не знайшла. Неўзабаве было ўстаноўлена, што ілжывую інфармацыю па мабільным тэлефоне даў мужчына, які пражывае ў гэтым доме. Ён ужо асуджаўся за рабаўніцтва і ўхіленне ад выплаты аліментаў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Утерянные бланки путевых листов серии АА № 6648616 и 6648643, принадлежащие ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», **считать недействительными.**

Згубленае пасведчанне інваліда ІІ групы № 0040115, выдадзенае на імя **БАГДАНАВАЙ Зінаіды Міхайлаўны, лічыць несапраўдным.**

Минский городской центр недвижимости

**Извещение о проведении торгов 4 июня 2008 года Производственно-строительное закрытое акционерное общество «Трест Промстрой» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже квартир без отделки в доме № 32 по ул. Пионерская в г. Минске**

| № лота | Наименование объекта: № квартиры | количество комнат | этаж | подъезд | Площадь, кв.м: общая | жилая | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 3 | 3 | 2 | 1 | 122,9 | 71 | 791 230 200 | 79 123 020 |
| 2 | 4 | 2 | 2 | 1 | 81 | 47,3 | 521 478 000 | 52 147 800 |
| 3 | 15 | 6 | 5 | 1 | 214,6 | 140,5 | 1 381 594 800 | 138 159 480 |
| 4 | 16 | 3 | 5 | 1 | 155,9 | 85,6 | 1 003 684 200 | 100 368 420 |

**Аукцион состоится 4 июня 2008 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

К участию в аукционе допускаются физические и юридические лица.

Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы в УП «Минский городской центр недвижимости»: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с объектом; соглашение о правах и обязанностях сторон; ксерокопию паспорта; заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение: 1) задатка в сумме 10 % начальной цены; 2) платы за регистрацию в размере 1/4 минимальной заработной платы.

Юридические и физические лица – нерезиденты Республики Беларусь кроме вышеуказанных документов предоставляют дополнительно: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; документ о финансовой состоятельности, выданный банком или иным финансово-кредитным учреждением, обслуживающим его, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

Если участник аукциона выражает желание участвовать в торгах по нескольким объектам, задаток вносится в размере 10 % от стоимости объекта с наибольшей начальной ценой. При подаче документов на участие в аукционе физическое лицо предъявляет паспорт, его представитель – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально. Внесение необходимых для участия в аукционе платежей осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Квартиры продаются только для использования под жилье. Граждане, выигравшие торги, обязаны вступить в товарищество собственников. Договор купли-продажи квартир с гражданами должен быть нотариально удостоверен и зарегистрирован в Республиканском унитарном предприятии «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Расходы, связанные с совершением нотариальных действий и государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности, оплачиваются победителем аукциона.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 10 рабочих дней со дня подачи заявления на возврат задатка или с момента регистрации организатором аукциона отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Все участники аукциона перед подачей заявления на участие в торгах должны детально ознакомиться с Условиями проведения аукциона и объектом. Оплата стоимости приобретенных на аукционе квартир осуществляется в установленном порядке по безналичному расчету в белорусских рублях в следующем порядке: 30 % в течение 5 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона и 70 % в течение 10 банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Договор купли-продажи квартир подписывается в течение 10 календарных дней со дня истечения срока, отведенного для оплаты, при условии внесения победителем полной оплаты за квартиру и оплаты за подготовку и проведение торгов организатору аукциона КУП «Минский городской центр недвижимости».

Победитель аукциона помимо оплаты за квартиры обязан в сроки, указанные в протоколе о его результатах, произвести оплату за подготовку и проведение аукциона УП «Минский городской центр недвижимости» сверх цены продажи в размере 0,5 % от окончательной стоимости квартиры.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 3 июня 2008 г. включительно по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6, в понедельник – четверг с 8.45 до 18.00, в пятницу с 8.45 до 16.45, 3 июня 2008 г. до 17.00 включительно.

**Телефоны для справок: 227 40 22; 227 48 36.**
**Интернет: www.mgcn.by.**

УНП 190398583

**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ**
по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

| Наименование предмета аукциона | Здание столярной мастерской и право заключения договора аренды земельного участка | Здание склада и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Белорусская, 22/1 | Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Белорусская, 22/2 |
| Продавец недвижимого имущества | УКП «Каменецремстрой», г. Каменец, ул. Я. Коласа, 6, тел. 801631 2 21 79, 2 37 79 | |
| Характеристика предмета аукциона | Фундамент буто-бетонный, стены кирпичные, крыша шиферная, площадь – 153 кв.м. Земельный участок площадью 0,1102 га, для создания производств, ограничения в использовании в водоохранной зоне р. Пульва, срок аренды – 99 лет | Фундамент буто-бетонный, стены кирпичные, крыша шиферная, пристройка, площадь – 338,6 кв.м. Земельный участок площадью 0,2326 га, для создания производств, ограничения в использовании в водоохранной зоне р. Пульва, срок аренды – 99 лет |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 14 293 794 | 32 679 083 |
| Сумма задатка, руб. | 1 430 000 | 3 268 000 |
| Организатор аукциона | Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, 20 87 85, 23 44 06, 23 12 63 www. brest–region.by | |

| Наименование предмета аукциона | Здание старой школы с хозпостройками и право заключения договора аренды земельного участка | Здание овощехранилища и право заключения договора аренды земельного участка | Здание мастерской и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|---|
| Продавец недвижимого имущества | Управление образования Кобринского райисполкома, г. Кобрин, ул. Матросова, 18, тел. 8 01642 2 16 62, 2 13 45 | | |
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская область, Кобринский район, д. Хабовичи, ул. Ленина, 37 | | |
| Сведения о предмете аукциона | Здание 1-этажное, площадь – 335,4 кв.м, фундамент кирпичный, стены и перегородки брус, перекрытие деревянное. Крыша шифер. Электроснабжение, печное отопление. Сарай, уборная, колодец. Земельный участок площадью 0,4663 га, с ограничениями в использовании земель (0,0170 га в охранной зоне линий электропередач); срок аренды – 50 лет | Здание 1-этажное, площадь – 11,1 кв.м, фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытие ж/бетонное. Крыша совмещенная, обсыпано землей. Без коммуникаций. Земельный участок площадью 0,0769 га, с ограничениями в использовании земель (0,0024 га в охранной зоне линий электропередач); срок аренды – 50 лет | Здание 1-этажное, площадь – 115 кв.м, фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытие деревянное. Крыша шиферная. Электроснабжение, камин. Земельный участок площадью 0,1164 га; срок аренды – 50 лет |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 36 724 000 | 345 000 | 1 557 000 |
| Сумма задатка, руб. | 3 672 400 | 34 500 | 155 700 |
| Организатор аукциона | Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 23 44 06, 20 87 85, www.brest-region.by | | |

| Наименование предмета аукциона | Здание социально-педагогического центра и право заключения договора аренды земельного участка | Здание бывшей базовой школы в комплексе с прилегающими постройками и право заключения договора аренды земельного участка | Здание чесального цеха и право заключения договора аренды земельного участка | Здание склада и право заключения договора аренды земельного участка | Здание сельского клуба и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская обл., Барановичский р-н, д. Новая Мышь, ул. Слонимская, 66 | Брестская обл., Барановичский р-н, д. Мицкевичи | Брестская обл., Барановичский р-н, г.п. Городище, ул. А. Рымши, 12 | Брестская обл., г. Барановичи, ул. Советская, 90а | Брестская обл., Столинский р-н, д. Узляжье, ул. Советская, 2а |
| Продавец недвижимого имущества | Отдел образования Барановичского райисполкома, тел. (01634) 5 23 45 | | КУПП по оказанию услуг «Барановичский РКБО», тел. (01634) 2 35 36 | КУРЭП «ЖРЭУ г. Барановичи», тел. (01634) 1 02 45 | Отдел культуры Столинского райисполкома, тел. (01655) 2 15 45 |
| Характеристика предмета аукциона | Здание 2-этажное с пристройкой, кирпичное, площадь – 947 кв.м, 1950 г.п., имеются коммуникации, сарай. Земельный участок площадью 0,9040 га, срок аренды – 25 лет | Здание школы 1-эт., площадь – 662 кв.м, здание котельной площадью 56 кв.м, сарай 1-эт., площадь – 92 кв.м, здание интерната 1-эт., площадь – 278 кв.м, здание овощехранилища 1-эт., площадь – 16 кв.м, артскважина глубиной 57 м. Земельный участок площадью 1,5684 га с ограничениями в использовании земель (0,0118 га в охранной зоне линий электропередач), срок аренды – 25 лет | Здание одноэтажное, кирпичное, с холодной пристройкой, 1958 г.п., площадь – 88 кв.м. Земельный участок площадью 0,0215 га, срок аренды – 25 лет | Здание одноэтажное с пристройкой и подвалом, кирпичное, площадь – 184,1 кв.м. Земельный участок площадью 0,0740 га, срок аренды – 50 лет | Здание одноэтажное с пристройкой, кирпичное, площадь – 196 кв.м, 1972 г.п., сарай, уборная, забор, колодец. Земельный участок площадью 0,1117 га, срок аренды – 25 лет |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 77 411 970 | 480 588 630 | 10 620 270 | 38 604 900 | 62 099 182 |
| Сумма задатка, руб. | 7 741 000 | 48 058 800 | 1 062 000 | 3 860 000 | 6209 000 |
| Организатор аукциона | Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 20 87 85, 23 44 06, www.brest-region.by | | | | |

Аукцион состоится **3 июня 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

*Для участия в аукционе представляются*:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал №100 ОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома.

3. Юридическим лицом – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица.

4. Индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации.

5. Иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

6. Представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

7. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

8. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Возможно предоставление рассрочки по оплате за право заключения договора аренды земельного участка.

Участник, ставший победителем аукциона, обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае рассрочки), возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и расходы на подготовку и проведение аукциона, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка.

*Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по **2 июня 2008 года включительно.***

УНП 200020538

**Наблюдательный совет ОАО «Молодечнолес»**

**<u>СООБЩАЕТ,</u> ЧТО 16.05.2008 ГОДА В 11.00 ПО АДРЕСУ: Г. ВИЛЕЙКА, УЛ. 1 МАЯ, 106, СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «МОЛОДЕЧНОЛЕС»**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Реорганизация ОАО «Молодечнолес» путем присоединения к нему УП «Ива» ОАО «Молодечнолес».

2. Внесение изменений и дополнений в устав ОАО «Молодечнолес».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Вилейка, ул. 1 Мая, 106, с 10 по 15 мая (с 9.00 до 16.30) либо 16 мая с 9.30 до 10.00.

Начало работы собрания — 16 мая 2008 года в 11.00.

Регистрация участников с 9.00 до 10.30 по предъявлению документа, подтверждающего личность, а представителю акционера и доверенность.

**Тел. 8 01771 35232.**

УНП 600066488

**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**БУКПП «Комбинат железобетонных изделий» на строительство жилого дома ГП-31 в микрорайоне «Сухарево-5» в г. Минске 10-этажного 3-секционного 119-квартирного со встроенным помещением товарищества собственников**

**Застройщик:** Бобруйское унитарное коммунальное производственное предприятие «Комбинат железобетонных изделий», зарегистрированное решением Могилевского областного исполнительного комитета от 21.10.02 года № 20-12 в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 700385036. Местонахождение: РБ, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 54. Режим работы: понедельник—пятница с 8.00 до 16.30, обеденный перерыв с 12.00 до 12.30.

За период с 2005 по 2007 гг. БУКПП «Комбинат железобетонных изделий» осуществило строительство 11 жилых домов на 1086 квартир в городах Бобруйске, Минске, Могилеве.

БУКПП «Комбинат железобетонных изделий» имеет лицензию на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведению инженерных изысканий для этих целей» № 02250/0428622 выд. Министерством архитектуры и строительства РБ на основ. реш. № 3 от 04.01.2008 г. на срок до 29.01.2013 г. Строительство осуществляется в соответствии с условиями договора о реализации права проектирования и строительства объекта от 31 марта 2006 г., заключенного с Мингорисполкомом.

**Проектно-сметная документация** разработана ПКУП «Минскпроект», прошла в установленном порядке государственную экспертизу, заключение № 0801-8-2007 от 19.09.2007 г.; государственную экологическую экспертизу, заключение № 665-2007 от 24.10.2007 г.

**Получено разрешение** государственного строительного надзора на производство строительно-монтажных работ № 2-208Ж-003/08 от 20.02.2008 г.

**Получены документы, удостоверяющие права застройщика на земельный участок:** свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» от 21.03.2008 г. № 500/577-1569 – на право постоянного пользования; от 20.03.2008 г. № 500/577-1568 – на право временного пользования.

**Объект строительства:** десятиэтажный трехсекционный 119-квартирный жилой дом по ГП № 31 в микрорайоне «Сухарево-5» в г. Минске.

**Конструкция дома:** Индивидуальный жилой дом по ГП № 31 запроектирован во Фрунзенском административном районе на территории строящегося микрорайона «Сухарево-5».

Участок свободен от застройки, территория участка 918,4м².

Проектом предусматриваются:

— планировочная организация дворовой территории с устройством автостоянки на 10 машиномест, детской площадки, площадки для отдыха, хозяйственной площадки, площадки для инвалидов, проездов, тротуаров и дорожек.

Конструкция наружных стеновых панелей принята трехслойная с утеплителем из пенополистирола толщиной 300 мм. Внутренние стены из бетона имеют толщину: межквартирные – 160 мм, межкомнатные – 120 мм. Перегородки в кухне – 60 мм.

Запроектированный жилой дом десятиэтажный, трехсекционный, имеет размеры 15,3х57,6 м. Высота стен этажа принята 2,65 м, стен подвала 2,1—2,4 м. Подземная часть здания решена с техническим подпольем для пропуска инженерных коммуникаций. На первом этаже размещено встроенное помещение товарищества собственников с отдельным входом. Здание оборудовано лифтами и мусоропроводами в лифтовом холле с поэтажным открытием мусороприемных клапанов.

В процессе строительства для эксплуатации жилого дома будет создано товарищество собственников. В состав имущества, являющегося общей долевой собственностью входят: места общего пользования, несущие и ограждающие конструкции, электрическое, сантехническое и иное оборудование и трубопроводы, находящиеся внутри и за пределами жилых и нежилых помещений дома, элементы озеленения и благоустройства.

**Сроки строительства:** начало – февраль 2008 г;
окончание – сентябрь 2008 г.

**Предлагается** 74 квартиры для привлечения физических лиц состоящих на учете, нуждающихся в улучшении жилищных условий Минского городского исполнительного комитета к строительству по договорам долевого строительства согласно требований Указа № 55 от 31.01.2008 г. из них:

1-комнатные — 33 квартиры
2-комнатные – 41 квартира

**Стоимость строительства 1 м²** по состоянию на 03.05.2008 г. составляет 1 758 675 белорусских рублей.

С планировками квартир, ходом работ по строительству объекта можно ознакомиться по адресу: г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 54. Договор долевого строительства разработан в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 55 от 31.01.2008 г.

**Дополнительную информацию можно получить по телефону: (80225) 43 27 74.**

УНП 700838204

# СЁННЯ

## Пыталіся? Адказваем...

### Конкурс паміж абітурыентамі-гараджанамі і абітурыентамі-вяскоўцамі

***— Не зусім зразумела, як на практыцы ажыццяўляецца асобны конкурс паміж абітурыентамі-гараджанамі і абітурыентамі з сельскай мясцовасці, асабліва калі на бюджэтныя месцы прэтэндуюць 100 гараджан і 2—3 выпускнікі з сельскіх школ?***

На месцы, устаноўленыя кантрольнымі лічбамі прыёму (без уліку лічбаў прыёму на навучанне на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі), спачатку залічваюцца абітурыенты, якія маюць права на залічэнне без здачы ўступных выпрабаванняў, затым абітурыенты, якія маюць права на пазаконкурснае залічэнне. А ўжо тыя месцы, што засталіся, дзеляцца прапарцыянальна пададзеным заявам сярод дзвюх катэгорый абітурыентаў: сельскіх і гарадскіх. У любым выпадку, менш чым адно месца выдзеліць для абітурыентаў з сельскай мясцовасці прыёмная камісія не зможа (калі, зразумела, будуць прэтэндэнты). Дарэчы, летась прахадны бал абітурыентаў — выпускнікоў сельскіх устаноў адукацыі ненамнога адрозніваўся ад прахаднога бала абітурыентаў — выпускнікоў гарадскіх устаноў адукацыі. А ў 32 ВНУ ён аказаўся роўным ці нават перавышаў прахадны бал гараджан.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ЮРЫСТАЎ КРАІНЕ ПАТРЭБНА МЕНШ, У ДЭФІЦЫЦЕ — ІНЖЫНЕРЫ І БУДАЎНІКІ...

У абітурыенцкім асяроддзі прайшлі чуткі, што сёлета Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка зменшыў набор на многія віды спецыяльнасцяў ледзь ці не ў два разы.

Так гэта, ці не? З такім пытаннем мы звярнуліся да **адказнага сакратара прыёмнай камісіі Сяргея ВАСІЛЬЦА**. Як ён нам растлумачыў, гэта цалкам стандартная працэдура. Але існуе і шэраг праблем.

**ПЕРШАЯ ЧАСТКА ПРАБЛЕМЫ**

Кантрольныя лічбы прыёму, або, іншымі словамі, план прыёму на бюджэтныя месцы, зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі. У адпаведнасці з гэтым планам і быў скарочаны прыём на дзённую бюджэтную форму навучання на 2008 год у рамках 4 працэнтаў па ўніверсітэце. Аднак на асобныя спецыяльнасці гэты працэнт можа быць значна вышэйшым.

**ДРУГАЯ ЧАСТКА ПРАБЛЕМЫ**

Міністэрства адукацыі дае даручэнні кіраўнікам ВНУ сфарміраваць план прыёму на платнае навучанне. Аднак у кожнай навучальнай установе ёсць ліцэнзія на падрыхтоўку пэўнай колькасці спецыялістаў. Зыходзячы з гэтай ліцэнзіі і кантрольных лічбаў прыёму, карэктуецца набор на платную форму навучання.

***— Як фарміруецца план прыёму?***

— На план набору ўплываюць розныя фактары. Але адзін з галоўных, калі наогул не асноўны, — гэта размеркаванне, — расказвае Сяргей Іванавіч. — У нас пастаянна колькасць заявак на выпускнікоў матэматычнага і фізічнага факультэтаў перавышае колькасць выпускнікоў, якіх мы можам накіраваць ва ўстановы адукацыі рэспублікі.

Гэта нядзіўна. Ахвотнікаў навучацца на гэтых спецыяльнасцях не вельмі шмат. Паводле даных за 2007 год, конкурс на факультэты матэматыкі і фізікі не перавышаў 1,3 чалавека на месца.

***— На якія спецыяльнасці назіраецца зніжэнне попыту?***

— Тэндэнцыя апошніх гадоў такая. Відавочна знізіўся попыт на выпускнікоў спецыяльнасцяў юрыдычнага, эканамічнага профіляў... А таксама на некаторыя педагагічныя спецыяльнасці. Напрыклад, у нас быў скарочаны набор на філалагічным факультэце.

***— Кантрольныя лічбы прыёму карэктуюцца кожны год?***

— Безумоўна, — гаворыць Сяргей Іванавіч. — Яны фарміруюцца зыходзячы з палітыкі дзяржавы, запатрабаванняў сістэмы адукацыі рэспублікі. А па-другое, існуюць нейкія агульныя тэндэнцыі. Калі, напрыклад, краіне патрэбныя спецыялісты атамнай энергетыкі, то трэба ж недзе браць гэтыя месцы...

Абітурыенты і іх бацькі, усе, каго цікавяць пэўныя спецыяльнасці, могуць наведаць універсітэцкую старонку ў Інтэрнэце і зрабіць свае высновы. На сайце БДПУ імя М. Танка *(new.bspu.unibel.by)* вывешана ўся інфармацыя аб прахадным бале, аб конкурсе, аб плане прыёму.

**ДАВЕДКА**

*1. У 2007 годзе ў ВНУ Беларусі было скарочана 700 бюджэтных месцаў.*

*2. Міністэрства адукацыі вывучыла запатрабаванне краіны ў спецыялістах з вышэйшай адукацыяй да 2015 года. Дзяржаве неабходныя кадры інжынернага, будаўнічага профілю, спецыялісты аграпрамысловага комплексу.*

**Ірына ЛЯШКЕВІЧ.**

Сяргей КАТАРЖЭНКА:

**Экстрым**

## «ЁСЦЬ ТАКАЯ ПРАФЕСІЯ — КАСКАДЗЁР!»



Сяргей Васільевіч Катаржэнка ў агні не гарыць, у вадзе ён не тоне, і нават ад куль не бяжыць, а таксама выходзіць цэлым з іншых самых экстрэмальных сітуацый. І чым больш экстрэмальнымі будуць яго прыгоды, тым лепш для яго самога, для рэжысёра фільма і для гледача, для кіно. Бо ёсць такая прафесія — каскадзёр. Каскадзёр — гэта лад жыцця, экстрым і рызыка ў якім займаюць галоўнае месца.

У дзяцінстве Сяргей, як і многія яго аднагодкі, любіў вярцецца на турніках, лазіць па будоўлях, катацца на крыгах лёду па рацэ. Юнаму Сяргею хацелася экстрыму, бо так жыць цікавей. Малады чалавек заўсёды быў у добрай фізічнай форме: пасля арміі стаў займацца матакросам, конным спортам, вечарамі хадзіў у цыркавы гурток. Пасля паспрабаваў сябе ў каскадзёрстве і зразумеў, што каму, як не яму, займацца гэтай цікавай і нялёгкай справай. Добрая фізічная падрыхтоўка і ўжо багаты асабісты вопыт дапамаглі Сяргею прайсці атэстацыю каскадзёраў і скончыць ВГІК.

Цяпер Сяргей Катаржэнка — прафесійны каскадзёр, арганізатар і пастаноўшчык трукаў. На яго ліку шмат вельмі рызыковых пастановачных сцэн, напрыклад, у фільме «Лара», дублюючы амерыканскага акцёра Джо Лару, Сяргей зрываўся з трапецыі пад купалам цырка, у фільме «Філіял» зусім не Дзмітрый Харацьян выпадае з акна шматпавярховіка, а Катаржэнка, ён жа таксама «вісеў» замест Сяргея Гармаша на гадзінніку на прывакзальнай плошчы ў «Паклонніку». «Падаць з даху, пераварочвацца ў машыне, гарэць — гэта звычайная руцінная праца, — кажа каскадзёр. — Вось уменне пераадолець страх за іншых, правільна выканаць кожны крок у вельмі строгім і паслядоўным плане, не збівацца з маршруту пры пастаноўцы той ці іншай сцэны, — гэта складаней».

Скачок Сяргея Катаржэнкі з вышыні 72 метры занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса. Таксама каскадзёр заўсёды імкнецца быць арыгінальным, прыдумляць, распрацоўваць і ставіць новыя сцэны. Напрыклад, менавіта Катаржэнка прыдумаў і паставіў унікальную «бочку» ў паветры — пераварот аўтамабіля на 450 градусаў. Тады ён па-сапраўднаму перапужаў гледачоў, таму што да гэтага пераварочваліся толькі аўтамабілі з дахамі, а Сяргей зрабіў пераварот у кабрыялеце. За што і атрымаў на міжнародным фестывалі прафесійных каскадзёраў у кіно ў Бярдзянску прэмію ў намінацыі «Лепшы трук у жывым выкананні».

— Для рэжысёра так: ён ідзе і гаворыць, вось тут мой герой павінен упасці са скалы на капот аўтамабіля. І гэта ўжо мая мэта — распрацаваць пастаноўку трука па пунктах, навучыць людзей, якія будуць дубляваць акцёраў, як і што трэба рабіць, і ўсё ж такі паставіць сцэну так, як таго хацеў рэжысёр. Менавіта так я і працую, і менавіта ў гэтым ёсць прафесіяналізм і запатрабаванасць каскадзёра ў кіно», — гаворыць Катаржэнка.

Поспех любога трука залежыць не толькі ад яго пастаноўкі, але і, вядома ж, ад выканання. А яшчэ і ад таго, каб дублёр пачаўшы выконваць дзеянне, не перадумаў, бо гэта — адна з самых страшных рэчаў. Калі герой пачынае скакаць з вышкі ў ваду, напрыклад, пры гэтым выконваючы нейкія дзеянні ў паветры, то самае страшнае — гэта калі акцёр перадумае і пачне штосьці рабіць не так, не па плану. Я заўсёды хвалююся за сваіх вучняў, мне страшна ад таго, што ім можа стаць страшна.

— Вядома, што вы ўзначальвалі школу каскадзёраў у Маскве. Ці не было такой ідэі стварыць падобную школу ў Мінску і трэніраваць беларускіх пачынаючых каскадзёраў?

— Цяпер я працую не проста з людзьмі з вуліцы, а са спартсменамі, якія да таго, як прыйсці ў каскадзёрства, шмат часу займаліся спортам, фізічна вынослівыя і падрыхтаваныя.

— Ці значыць гэта, што выпадковых людзей у каскадзёрстве няма?

— Безумоўна, няма. Калі чалавек можа праехаць перад дзяўчатамі на матацыкле на адным коле, то гэта не азначае, што ён можа быць каскадзёрам. Здымачная пляцоўка і тыя секунды пастановачных сцэн з каскадзёрамі на экране, якія бачыць глядач, — дзве вельмі розныя рэчы.

Напрыклад, памятаю, як здымалі «Анастасію Слуцкую». Там у некаторых герояў, якія працавалі з коньмі, былі вельмі спецыфічныя касцюмы, якіх не толькі жывёліна, але і чалавек можа спужацца: там воўчая шкура, вельмі незвычайны грым. Акцёры ўжо хацелі здымаць сцэны, але тут я прапаноўваў пачаставаць жывёліну цукрам, даць каню абвыкнуць і толькі тады здымаць. Так і сталася: жывёліна спужалася касцюмаў, нават калі яе пачаставалі цукрам, і страшна падумаць аб тым, што магло б адбыцца, калі б прыступілі да здымак не падрыхтаваўшыся. Тады ўсе здзівіліся, маўляў, як ты, Катаржэнка, ведаў пра гэта? А пра гэта немагчыма ведаць, гэта трэба адчуваць. Мая прафесія — гэта яшчэ і правільна адчуваць тое, што можа адбыцца.

Сяргей Васільевіч — вельмі цікавы суразмоўца, пра сваю прафесію (яна ж і любімая справа) можа расказваць шмат цікавых гісторый і ўспамінаў. Але ён таксама — адзін з самых запатрабаваных пастаноўшчыкаў трукаў, таму пасля нашай размовы адразу адправіўся на здымачную пляцоўку, дзе яго зноў чакаюць прыгоды, экстрым і шмат працы. Бо каскадзёрства — гэта своеасаблівы стыль жыцця. Бо каскадзёр — гэта чалавек, які жыве прыгодамі. Бо ёсць такая прафесія — каскадзёр.

**Надзея БАС.**

Ганна ЦЯРЭНЯ:

**Каралева спорту**

## «Спартсмены як мужчыны для мяне не існуюць»



**Ганна Цярэня ўвогуле дзяўчына бясстрашная — не баіцца ні скачкоў праз галаву (траўматычны, дарэчы, занятак, хоць яна рэзонна пярэчыць, што не абавязкова займацца акрабатыкай, каб трапіць на бальнічны ложак), ні дзяржэкзаменаў (спартсменка заканчвае акадэмію фізвыхавання), ні інтэрв'ю даваць напярэдадні адказных падзей, што многія спартсмены лічаць дрэннай прыкметай. Насцярожана яна ставіцца толькі да супрацьлеглай палові. Выклікаць давер гэтай бландзінкі, адным словам, вельмі няпроста.**

**— Як да экзамену падрыхтавалася?**

— Пакуль настрой нармальны. Магчыма, заўтра стане страшна. Паміж трэніроўкамі не надта вывучыш. Калі я ад'язджала з дому, ішоў дождж. Таму ўсё павінна атрымацца...

**— Добрая прыкмета?**

— Лічыцца, што так. Калі едзем на спаборніцтвы ў дождж ці снег, то ўсё будзе добра. З іншага боку, я стараюся не быць занадта прымхлівай.

**— Спартсмены больш вытрыманыя ў псіхалагічным плане. Гэта ў жыцці дапамагае, на экзамене ў прыватнасці?**

— На экзамене ўсё залежыць ад узроўню ведаў кожнага. Некаторыя, і такіх людзей шмат, думаюць, што спартсмены ўвогуле недалёкія. У цягніку нядаўна пазнаёмілася з маладым чалавекам, матэматыкам. Ён сядзіць з кніжкай, чытае сваю матэматыку. Бачыць, што я па-спартыўнаму апранута, спытаў, ці не маю я дачынення да спорту і давай здзіўляць мяне сваімі навуковымі ведамі. Усё дапытваўся, дзеля чаго спартсмены губляюць сваё здароўе. «Каб тры хвілінкі пастаяць на п'едэстале з медалём?» «Каб потым у вас інтэрв'ю ўзялі?» «У чым сэнс?»

**— А і сапраўды, у чым сэнс, Аня?**

— Кожнаму сваё ў жыцці дадзена. Камусьці вынаходзіць новыя формулы, а камусьці праз галаву лятаць. Было б не цікава, калі б усе мы былі аднолькавыя. Ён, дарэчы, сказаў, што яго мэта — вынайсці новую формулу. А на мой погляд, усё ў чалавеку павінна быць гарманічна. Я яму і кажу: вось паглядзі на сябе, ты такі поўненькі, разумовае перанапружванне ў цябе стопрацэнтнае, гэта ж таксама праблемы са здароўем. Спрачалася я з ім, спрачалася, а ён мне ўсё пра навуку. Хоць я не вельмі настойвала, ну падабаецца яму так думаць і добра.

А наконт п'едэстала... Асабіста мне хочацца даказаць, што і ў нас ёсць таленавітыя людзі. Спорт — гэта характар, эмоцыі, патрыятызм, нарэшце. Сама атмасфера спаборніцтваў, калі збіраюцца людзі, аб'яднаныя нейкай ідэяй, гэта як наркотык... Ведаеш, вось дома падыходзіш да люстэрка, адзенеш на шыю ўсе свае медалі і разумееш, што чагосьці ў жыцці ўжо дасягнуў, што гады прайшлі не дарэмна.

**— Колькі секунд займае выступленне?**

— Скачок, а гэта разбег і 8 элементаў на 20-метровай дарожцы, у мяне займае 7—8 секунд, максімум 10. Адзіночнае сальта, двайное, з піруэтамі — вельмі прыгожы від спорту. Гледачоў заўсёды шмат на спаборніцтвах. Ён папулярны і ў Еўропе — у расіян, англічан, французаў, бельгійцаў, палякаў. У 2004 годзе на чэмпіянаце свету раптам з'явіліся кітайцы, а яны ўвогуле не займаюцца неалімпійскімі відамі. Проста раней краіна, якая праводзіць Алімпіяду, мела права ўключыць у праграму адзін від спорту, які, на яе думку, дастойны стаць алімпійскім. І кітайцы збіраліся ўключыць менавіта акрабатычныя скачкі. А нядаўна гэта права адмянілі. Цяпер адна надзея, што гімнасты з намі падзеляцца (у іх медаль можна выйграць і ў мнагабор'і, і ў асобных відах) і ахвяруюць сваім якім-небудзь відам, напрыклад, скачком праз каня. Але па ўсім бачна, што і гімнасты не маюць намеру без бою саступаць, таму невядома, як усё будзе.

У нас прадмет быў ва ўніверсітэце «Цывілізацыя і алімпізм», дзе мы праходзілі, чаму від уключаюць у алімпійскую праграму. Абавязкова трэба, каб на трох кантынентах жанчыны займаліся гэтым відам спорту і каб было як мінімум 30 краін. Я пачала лічыць на паперцы і 30 краін налічыла. І ўсюды, акрамя Антарктыды, скачуць — і ў Аўстраліі, і ў Бразіліі. Але неалімпійскі від і ўсё.

**— Няўжо і ў Афрыцы?**

— Мы ў Афрыцы былі на спаборніцтвах — у 2004 годзе ў Алжыры праходзіў чэмпіянат свету. Там якраз было ваеннае становішча. Нас нікуды не адпускалі, толькі ў гасцініцы, як у турме. І на аўтобусе пад аховай вазілі ў залу. Жанчыны ўвогуле па вуліцах не ходзяць. Мужчыны ў масках, адны толькі вочы бачныя, са зброяй. У магазін ніхто не ходзіць, мы там ні долара не патрацілі. Але хтосьці ж дабіўся права правесці там чэмпіянат... Так што ёсць цёмнаскурыя спартсмены — белыя зубы, белая форма, а сам чорны-чорны.

**— А ў нас абывацель мае ўяўленне аб тым, што такое спартыўная акрабатыка?**

— У Віцебску многія ведаюць, паколькі там у нас самая моцная школа акрабатычных скачкоў. А ўвогуле, калі гаворыш акрабатычныя скачкі на дарожцы, адразу ўдакладняюць: на дарожцы дывановай, якая на падлозе рассцелена? У кагосьці асацыяцыя з гімнастыкай, аэробікай...

**— Крыўдна, што прысвяціўшы столькі часу спорту, на Алімпіяду — мару ўсіх спартсменаў — так і не трапіш?**

— Раз у чатыры гады ў нас праходзяць Сусветныя гульні для неалімпійскіх відаў спорту. Сумо там ёсць, напрыклад, бодыбілдынг, аэробіка, асобныя віды мастацкай гімнастыкі. У 2005 годзе яны праходзілі ў Германіі, у 2001-м — у Японіі, там медаль такі прыгожы — аналаг алімпійскага. Я трэцяй была ў Японіі, а ў 2005-м — чацвёртай. Чацвёртае месца — для мяне балючае пытанне. У мяне іх шмат. Для каманды гэта плюс, бо ў залік ідуць ачкі, а ўвогуле крыўдна, што і казаць. На чэмпіянаце свету ў канцы 2007 года ў Канадзе я заняла 4-е месца, прайграла, здаецца, усяго бал. Побач, але не на п'едэстале. Гэтак жа і пра другое месца — здаецца, побач з першым, а розніца вялікая. У нас лічыцца, што другое і чацвёртае — крыўдныя месцы.

Хоць вельмі важна, што займаешся любімай справай — я ж жыла акрабатыкай з дзяцінства. Месяц адпачынку летам у бабулі ў вёсцы — праз тыдзень на руках пачынаеш хадзіць. Сумна асэнсоўваць, што калісьці ўсё закончыцца.

**— Прыйдзецца забыць пра акрабатыку і пачаць новае жыццё?**

— Усё, чаму навучылася, можна ў жыццё перанесці. У нас такі від спорту, што мы можам удзельнічаць у відовішчных паказах, шоў, паглядзець свет. У Канадзе ёсць цырк Du Suleil — уразіла яго выступленне, у Дзмітрыя Паляруша ў Амерыцы шоў. Ён часта запрашае нашых паўдзельнічаць. Я з задавальненнем яшчэ раз паехала б у Канаду. Была там два разы, і мне вельмі спадабалася. Мы былі ў горадзе Квебек — былая французская калонія. Там шмат французаў, мова захавалася. Сам стары горад — гарматы з вайны захаваліся, крэпасці, будынкі. Праліў прыгожы. Мы былі там тыдзень, часу хапіла пахадзіць, паглядзець. Паміж спаборніцтвамі хочацца падумаць аб чымсьці іншым. Раней я вельмі засмучалася, што заўсёды адна, бо ў нас няма жаночай каманды. І нават зайздросціла саперніцам — у каго ні вазьмі, у камандзе чатыры дзяўчынкі. А я чатыры гады ў мужчынскім калектыве сярод спартсменаў і трэнераў. Не хапае жаночай кампаніі. Аднойчы трэнеру паскардзілася, на што ён сказаў: «Вераб'і лятаюць чародамі, а арол заўсёды адзін».

**— Затое ў мужчынскім калектыве нашмат прасцей, тым больш з прывабнай знешнасцю...**

— У мужчынскім калектыве прыгажосць, магчыма, і дапамагае. Але мужчыны ў нас такія непастаянныя, што надта разлічваць на іх не трэба.

**— Адкуль такі песімізм?**

— Не песімізм, а проста насцярожаны погляд. Было ў мяне непрыемнае расчараванне. Цяпер я стала больш уважлівай. Мне здаецца, гэта правільна. Чалавек быў вельмі добры, і я кахала яго. Але нічога ў нас не атрымалася. Гэта спартсмен, таму цяпер спартсмены як мужчыны для мяне не існуюць. Ён нядаўна ажаніўся, я ўжо ні сябе, ні яго ні ў чым не абвінавачваю. Проста вырашыла для сябе, што ў адносінах з процілеглым полам патрэбная пэўная доля эгаізму, нават калі, насамрэч, у характары ён не закладзены. І ў мяне атрымліваецца. Як бы моцна ні кахаў чалавека, ні ў якім выпадку нельга дазваляць яму сябе крыўдзіць. Было балюча, але я прымусіла сябе ўстаць і пастаралася даказаць, што таксама чагосьці вартая, каб чалавек праз шмат гадоў убачыў цябе іншымі вачыма. Тады для мяне гэта было важна...

**— Зараз у цябе іншы малады чалавек. Раскажы, дзе спартсменкі, якія часта паспяхова выходзяць замуж, знаёмяцца з прыстойнымі маладымі людзьмі.**

— Калі шчыра, знаёміцца ў грамадскіх месцах я не люблю. Жыццё мяне навучыла, што спачатку ўсе такія добрыя, калі імкнуцца табе спадабацца. А потым ужо зусім па-іншаму разгортваюцца падзеі. Звычайна гэта або спартсмен, або добры знаёмы. Чым прывабліваюць спартсменкі? Магу сказаць толькі за сябе. Я люблю тое, чым я займаюся, свой від спорту, ды і ўвогуле фізічныя практыкаванні. Прыемна ж асэнсоўваць, што тое, чым ты займаешся, станоўча ўплывае на здароўе. Некаторыя столькі грошай трацяць на фітнэс, асабістых трэнераў. Нядаўна прыйшла ў школу на практыку. Дзяўчаты ў старэйшых класах такія лянівыя. Спаднічка каротка, абцасікі, доўгія пазногці, стаіць, мячык адбівае далонню. А потым са школы прыходзіць і кажа: «Мама, штосьці я паправілася, трэба мне пайсці на фітнэс». Навошта траціць гэтыя грошы, калі можна на фізкультуру пайсці, там пабегаць. Вы ж будзеце ўвагу прыцягваць, падабацца хлопчыкам. У нас нармальная праграма па фізкультуры, калі займацца, можна без фітнэсу добра выглядаць. Чаму нельга прыйсці і прэс пакачаць ці проста пабегаць — абменныя працэсы паляпшаюцца. Тым больш, што вам гэта прапануюць бясплатна. Сядзяць і кажуць: «Ай, не пайду, стаўце мне, што хочаце». А яшчэ: «А я тату ў школу прывяду, калі вы мне двойку паставіце». Дзеці цяпер такія, няпроста з імі ў школе працаваць. Я проста за здаровы лад жыцця. А многія думаюць: ну трэба ж, якая правільная...

Сёння мне здаецца, праблема з наборам і ў многіх відаў спорту. Дзяцей цяпер не зацікавіць паездкамі, ганарарамі, калі бацькі добра зарабляюць, ім не цікава кожны дзень працаваць на трэніроўках. Мой трэнер, напрыклад, вёў у мяне фізкультуру ў дзіцячым садку, ён прыйшоў туды працаваць, каб набраць групу. Так што я з дзяцінства ў акрабатыцы. Столькі прапаноў было — запрашалі ў спартыўную гімнастыку, у музычную школу, так хацелася на танцы спартыўныя... Але ў выніку я выбрала акрабатыку. Вельмі падабалася мне тады, як гучыць слова акрабатка, адразу цырк уяўляецца. Купілася на словы, карацей...

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

***—АДКУЛЬ на Беларусь прыязджае больш за ўсё турыстаў і якія краіны карыстаюцца папулярнасцю ў беларусаў?***

*— Па-ранейшаму вельмі многа замежных турыстаў прыязджае з суседніх краін. Дамінуюць расіяне, украінцы, літоўцы, палякі, немцы, італьянцы, англічане, чэхі, госці з Ізраіля і ЗША.*

*{...}Па статыстыцы, беларусы бываюць прыкладна ў 140 дзяржавах штогод, і прадстаўнікі такой жа колькасці краін наведваюць Беларусь.*

**(З інфармацыі, прадастаўленай Дэпартаментам па турызме Міністэрства спорту і турызму Беларусі).**



# РЭПУТАЦЫЯ ГАСЦІННАГА ЛІЦЬВІНА

## (Частка другая)

Мая знаёмая Хайдрун прыехала ў Беларусь з Аўстрыі на тры месяцы. Яе муж — прафесар, выкладае ў БДУ. У Беларусь ён прыехаў не адзін, а з сям'ёй: жонкай і трыма дзецьмі. Увогуле, на маю прапанову дапамагчы, Хайдрун згадзілася адразу. Толькі патлумачыла, што, насамрэч, турысты рэдка ходзяць у адзіночку па незнаёмым горадзе, а прыязджаюць звычайна групамі, для якіх спецыяльна наймаецца гід і перакладчык. Таму ўсе нашы далейшыя спробы тэставання таваразнаўцаў — адносныя, але з намі ўсё так і адбывалася.

Каб праверыць гатоўнасць сталічных прадуктовых магазінаў да турыстычнага наплыву, мы выбралі адзін з найвядомейшых раёнаў сталіцы, дзе іншаземцы, дарэчы, не рэдкасць — Нямігу.

**БЕЛАРУСЬ І ВЕТЛІВЫЯ ТУЗЕМЦЫ**

Яшчэ перад тым, як мы рушылі «на заданне», я расказаў Хайдрун нашу схему, раптам — запытае хто? Яна была простая: прыехалі з Аўстрыі да знаёмага ў Мінск. Выдалася вольная хвілінка, якую вырашылі скарыстаць з карысцю, прайсціся па магазінах. Рабочай мовай аб'яўлялася нямецкая.

— Добры дзень, можа ў вас ёсць беларускія народныя інструменты? — зайшоўшы ў краму і беручы ініцыятыву ў свае рукі, пачынаю я.

Таваразнаўца ўсміхнулася і запрасіла нас у залу.

Напачатку я ўжо было абрадаваўся — па-нямецку разумее — але, на жаль, спадзяванні мае былі марнымі. На пытанне, што гэта за інструмент, а паказала яна нам першым чынам т. зв. «палку дождя», таваразнаўца толькі маўчала і ўсміхалася.

Далей на пытанне, а ці ёсць што-небудзь яшчэ, жанчына пацягнулася за самай вялікай акарынай. Дастаўшы яе з паліцы, пачала тлумачыць прынцып карыстання. Па-руску, вядома.

Інструмент цікавы і мне спадабаўся, але адзін мінус — завялікі. Пытаю пра такі ж, але меншы. Таваразнаўца зноў усміхнулася: «Я не понимаю».

І тут мне на дапамогу прыйшла Хайдрун. Жэстамі яна і растлумачыла, што азначае нямецкае слова «kleiner» (меншы).

Маленькая акарына мне спадабалася і я вырашыў падарыць яе Хайдрун у знак падзякі і як памяць пра Беларусь.

Аплачваючы пакупку, папрасіў касірку пра гэты інструмент расказаць. Мінулы раз, калі я купляю тут акарыну — у верасні мінулага года — жанчына распавяла вельмі цікавую гісторыю пранікнення і распаўсюджвання гэтага музычнага інструмента на Беларусі. Памятаю, мне тады вельмі спадабалася гэта гісторыя. Я нават запісаць хацеў.

Але на гэты раз не давялося яе пачуць. Касірка толькі развяла рукамі: «Не разумею», маўляў.

Аднабокі нейкі кантакт атрымаўся. Калі б купіў сапраўдны іншаземец і завёз на сваю радзіму, як бы ён, цікава, прэзентаваў яго сваім сябрам. «Вось, гэта такая штучка, якую я купіў у адной з сувенірных лавак Беларусі, на ёй іграць можна...»

Шкада, што менавіта моўны бар'ер можа стаць праблемай і перашкодай у зацікаўленасці турыста беларускай традыцыяй і культурай.

Але вось спецыяльна для Хайдрун таваразнаўцы дасталі з паліцы кнігу пра Беларусь на рускай і нямецкай мовах. Кнігай мая «напарніца» зацікавілася.

— Дзецям у школе пасля нашага вяртання ў Аўстрыю, трэба будзе пісаць сачыненні пра Беларусь, — патлумачыла Хайдрун.

Пакуль Хайдрун разглядала кнігу, адна з таваразнаўцаў як бы незнарок вынесла вялікую (сантыметраў 30) статуэтку хлопчыка са скрыпкай, ды неяк таемна ўсміхаючыся, сказала мне:

— Вось... Таксама музыкант...

Напачатку я не зразумеў гэтай таемнай усмешкі, але, зірнуўшы на кошт «хлопчыка са скрыпкай», да мяне, як кажуць, дайшло. Статуэтка каштавала амаль Br2 млн.

— Дорага, але затое бронза. Брон-за, — паказваючы, які гэта цяжар, нібы апраўдваючыся на мой позірк, адказала таваразнаўца.

«Няўжо, акрамя іншаземцаў, няма больш пакупнікоў на такія «цяжкія» сувеніры?» — падумаў я пра сябе, выходзячы на вуліцу.

Хацелася ведаць і ўражанні Хайдрун. Сапраўдны імшаземец з нас усё ж такі яна. А вось ёй — крама спадабалася асабліва. Першым чынам з-за ветлівасці таваразнаўцаў:

*— У цэлым, калі таваразнаўца ветлівы, зусім не так важна, разумее ён нямецкую мову, ці не. Усмешка злучае больш чым тысячы слоў! У Аўстрыі кажуць: «Больш пчол зловіш з лыжкай мёду, чым з цэлай бочкай, поўнай воцату».*

**ПРА ГАРЭЛКУ І СВЕЖАЕ МЯСА**

Па дарозе да аднаго невялічкага прадуктовага магазіна ля Палаца спорту Хайдзі расказала, як у Аўстрыі ідуць справы са славянскімі мовамі...

*— Рускую мову я пачала вучыць самастойна. Ведаю ўжо некалькі слоў, — усміхнулася яна і дадала, — гэта складана, вядома ж, але ў нас можна і беларускую мову вывучаць. Ва ўніверсітэце ёсць спецыяльны накірунак — славістыка, дзе выкладаюцца беларуская і руская мовы. У Аўстрыі даволі цяжка знайсці беларускую літаратуру. Я знайшла толькі дзве кнігі, гэта былі Колас і Быкаў у перакладзе.*

Вось мы і падышлі да магазіна. Яшчэ раз нагадалі сабе, што не збіраемся нічога набываць, бо самі ведаеце, як гэта бывае ў магазінах: ідзеш па хлеб — вяртаешся з поўнай сумкай усяго непатрэбнага...

— Калі параўноўваць беларускія цэны на прадукты з цэнамі ў Аўстрыі? — пытаюся я, паказваючы на хлеб коштам 1650 рублёў.

— Кілаграм хлеба у нас каштаваў бы каля трох еўра (каля 9 беларускіх тысяч. — **Аўт.**). Але, у прынцыпе, тут прадукты больш танныя.

Мясны аддзел (у бліжэйшыя выхадныя я хацеў прапанаваць маім аўстрыйскім сябрам выезд на прыроду). Адзін з нямногіх у гэтай краме, плаціць за пакупку ў якой трэба на месцы. З ініцыятывы Хайдрун вырашылі запытаць пра свежае мяса. Таваразнаўца — маладая дзяўчына — нешта засяроджана пісала на стале за прылаўкам.

— А ці ёсць у вас свежае мяса? — пытаюся я па-нямецку.

— Я вас не понимаю, — амаль не адводзячы вачэй, прабубнела яна.

Тут па-руску паспрабавала Хайдрун:

— М'ясо.

— Вот, — патлумачыла дзяўчына за прылаўкам, паказваючы на пухлыя сасіскі, каўбаскі і грудзінкі.

Але мы вырашылі не адступаць, хацелі даведацца менавіта пра свежае мяса, таму давялося шукаць дапамогі ў слоўніку. У руска-нямецкім слоўніку Хайдрун паказала на слова «цяляціна».

— Нет-нет, у нас тут нету, — пачуўся адказ.

— Где? — спрабавалі мы запытаць.

Дзяўчына, нарэшце зірнуўшы на нас і адарваўшыся ад важнага занятку, як бы штось узгадаўшы, раптам вельмі эмацыянальна паказала рукой у бок выхаду:

— Идите туда! Там, в следующем магазине!

Мы пайшлі.

«Увогуле, таваразнаўцы ў вас дружалюбныя, прыветныя, — кажа Хайдзі і ўсміхаецца. — Але наўрад ці турыст стане, як гэта раблю я, шукаць у продажы свежае мяса». Увогуле, у вас магазіны пабудаваны па тым жа прынцыпе, што і нашыя: па тыпу супермаркета. Сам выбіраеш, а пасля толькі плаціш. Праблем з пакупкай амаль няма. Зусім іншая рэч у ларках. Там, каб штосьці купіць, трэба гэта спачатку назваць. А не ведаючы мовы, даволі складана зрабіць пакупку, карыстаючыся аднымі толькі жэстамі.

«Наступны» магазін, дзе свежае мяса павінна было быць, прызнаюся шчыра, мяне самога здзівіў той колькасцю асартыменту, які прапаноўваўся пакупнікам. А пра аддзел свежага мяса нам сапраўды не схлусілі. Свініна, цяляціна, адным словам, — свежаніны на любы густ.

Працягваючы параўноўваць беларускія цэны з аўстрыйскімі, я ўсё цікавіўся, колькі ў Аўстрыі каштуе шакалад, колькі каштуе набор посуду... Хайдрун распавяла цікавую гісторыю:

— У нас сталяр за месяц зарабляе да трох тысяч еўра. Цэны ў нас больш-менш падобныя. Розніца ў тым, колькі могуць дазволіць купіць сабе на заробак беларусы ў параўнанні з аўстрыйцамі. Колькі ў вас зарабляе сталяр?

— Ну, не ведаю, — разгубіўся я ад нечаканага пытання. — Але дакладна менш за тры тысячы еўра, не буду маніць, калі гэтую лічбу можна смела дзяліць на тры...

Такімі вось разважаннямі падышлі мы і да віна-гарэлачнага аддзела. У Аўстрыі, як прызналася Хайдзі, гарэлка — даволі дарагая рэч. «Зараз праверым, колькі каштуе сапраўдная беларуская гарэлка», — інтрыгуючы, кажу Хайдрун.

— Пакажыце, калі ласка, беларускую гарэлку, — спрабую па-нямецку я.

Дзяўчына-таваразнаўца ўсміхнулася і ...не зразумела.

— Wodka. Belarus, — падтрымала мяне Хайдрун.

Да дзяўчыны ў момант вярнуўся дар мовы:

— Пожалуйста, — падводзячы да стэлажа з гарэлкай, ветліва раіць дзяўчына, — эта, эта и эта. — І дадае: — А вот эта — гут!

Дзяўчо аказалася сапраўднай шчырай беларускай. Заўважце, не спрабавала ўсунуць нам дарагую гарэлку з улікам, што іншаземцы, маўляў, народ багаты, а параіла гарэлку па кошту даступную і звычайнаму беларусу. Вось дзе беларуская сумленнасць!

**А ЯК У ПРЫВАТНІКАЎ?**

З дзяржаўнымі магазінамі мы больш-менш разабраліся. Стаяла пытанне: а як у прыватнікаў? Можа, у прыватных магазінах таваразнаўцы як на падбор — з веданнем замежнай мовы? Гэта мы праверылі на прыкладзе аднаго прыватнага салона адзення, які таксама знаходзіцца на Нямізе.

Зайшоўшы, адразу паспрабавалі спытаць у жанчыны-таваразнаўцы: sprechen Sie deutsch?

Тая адмоўна паматала галавой.

— Do you speak English? — падхапіла Хайдрун.

Зноў адмоўны жэст.

— Азіза, падыдзі. Можа, дапаможаш тут маладым людзям, — паклікала таваразнаўца падмогу.

Насустрач нам выйшла дзяўчына гадоў 27, на бэйджу якой было напісана чамусьці Вольга. Вольга была з выглядам, быццам яе адарвалі ад вельмі важнай працы.

Высветлілася, што дзяўчо разумее па-англійску. Хайдрун спытала, ці ёсць у продажы жаночыя спадніцы?

Па-руску Вольга пераклала сваёй сяброўцы-таваразнаўцы, тлумачачы:

— Юбку им нужно... — і звяртаючыся да нас, дадала. — Пройдите дальше, там может, в магазинах.

Вось вам і дапамагаюць з кансультацыяй іншаземцам.

Жывучы ў Еўропе і пастаянна спрачаючыся, у нашай краіне знаходзіцца яе цэнтр ці не ў нашай, мы забываем пра тое, што каб у Беларусь іншаземцы пачалі прыязджаць часцей, трэба іх зацікавіць і запомніцца нечым адметным. Пакуль што — гэта дранікі, Браслаўскія азёры, Белавежская пушча і... ветлівасць. А як прыемна будзе беларусам, калі іх запомняць і як народ паліглотаў. Ці не так, дарагія чытачы?

**Ілля ЛАПАТО.**

**Фота аўтара.**

## ПАНЯДЗЕЛАК, 5 МАЯ

**6.30 Драма «Даравальная нядзеля».**
**8.05** Брытва Акама.
**8.30** Існасць.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.05** Здароўе.
**9.40 Серыял «Давай пажэнімся».**
**10.15** Шпілька.
**10.50** Тайны смак.
**11.25** Ранішняя хваля.
**12.15** Мужыкі.
**12.45** «Кубанскі казацкі хор». Канцэрт.
**13.55** «Згублены свет».
**14.25** Мужчынскі характар.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.25** Культурныя людзі.
**15.55** Час кіно.
**16.25 Меладрама «Нечаканая радасць».**
**19.30** Час спорту.
**19.55** Хакей. Чэмпіянат свету. Швейцарыя—Беларусь.
**22.15** Панарама.
**22.55 Драма «Англійскі пацыент».**

**7.00** «Наша раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30, 3.00, 5.00** Нашы навіны.
**9.05** Контуры.
**10.10** «Дыханне планеты».
**10.40** «Вясенні жарт з...».
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** «Асцярожна — ежа!» Фільм 2-і.
**14.05 Маст. фільм «Вясна на Зарэчнай вуліцы».**
**16.10, 20.55, 3.20** Навіны спорту.
**16.15** «VI Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь-2008». Фінал.
**19.30** Чакай мяне.
**21.00 Серыял «Выклік-2».**
**23.10** «Гібель Гайдара. Легенда аб чырвоным вершніку».
**0.10** «Бразільскі футбол на АНТ».
**2.10** Ударная сіла. «Спадчынніцы Афіны».
**3.30—5.00** Тэхнічная прафілактыка.
**5.05** «Дэтэктывы».
**5.30 Маст. фільм «Асенні марафон».**

**ЛАД**
**7.45** Звон.
**8.15** Бухта капітанаў.
**9.00** Наша пяцёрачка.
**10.00** Несвоечасова.
**10.35** Школа рамонту.
**11.40** Клуб былых жонак.
**12.40** Дак. фільм «Слова — наша зброя».
**13.10** «ПРАсоўванне+».
**13.30** Тэлебарометр.
**13.45** Канцэрт, прысвечаны 70-годдзю народнага артыста Беларусі Міхаіла Казінца.
**15.00** «Страсці па культуры».
**15.45 Серыял «Дзве зоркі».**
**18.00 Камедыя «Крутая кампанія».**
**20.10** Анекдот. LAD.
**20.30 Меладрама «Блізка да сэрца».**
**22.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**23.55** Хакей. НХЛ. Плей-оф. Матч тыдня.

**ТВ РЕН**
**5.40 Фільм-казка «Вясёлыя сны або смех і слёзы».**
**7.45** «Вялікае снеданне».
**8.25** «Прачніся і спявай».
**9.00** «Тыдзень».
**10.00** «Спартыўны тыдзень».
**10.30** «Горад дзяцінства».
**10.45 Маст. фільм «Дарагі мой чалавек».**
**13.00** «Ёсць кантакт».
**13.30** «Народжаныя ў СССР».
**14.15** «Культурнае жыццё».
**14.45** «Геркулес». Мультсерыял.
**15.30, 23.00** «Крутыя рабяты».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьма-нявідзьма».
**17.25** «Званая вячэра».
**20.05 Маст. фільм «Сядзелка».**
**22.10** «Гучная справа».
**23.10** «Сталічны футбол».
**23.40** «Рэтраманія».
**0.40 Маст. фільм «Амнезія».**

**Мир**
**5.00, 6.15, 7.00, 1.15** Садружнасць live.
**5.30, 14.30 Серыял «ОБЖ».**
**6.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**6.45** Камерцыйная праграма.
**7.30** «Мар, дзейнічай, будзь!».
**8.00** «Разам».
**9.15** «Ведаем рускую».
**10.15** «Дзень пасла».
**10.30 Серыял «Дзікі месяц».**
**11.30** Дак. серыял «Дзіўнае жыллё».
**12.15** Студыя 60х90.
**12.25, 22.25 Маст. фільм «Яблыкі 41 года».**
**14.15** «Вучым англійскую».
**15.25, 0.15** Дак. серыял «Тайны і падарожжы».
**16.25, 1.40** «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
**17.25, 2.30** «Лепшае з Джэнтльмен-шоў».
**18.25** Акцэнты.
**18.45 Серыял «Афіцэры».**
**19.45** «Памяць». «Жывым так трэба».
**20.00** «Агульны інтарэс».
**20.30** «Рэспубліка сёння».
**20.45** «Суседзі».
**21.25 Серыял «Чорны спіс».**

**ВосьМой**
**7.00, 10.50, 18.10** «Навіны кіно».
**7.10** «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
**7.25, 21.05, 23.40** «Метэапрагноз».
**7.30 Маст. фільм «Дайце кнігу скаргаў».**
**8.55** «К-гульні».
**9.00** «Клуб-700».
**9.30** «К-відэа для дзяцей».
**9.50** Дак. серыял «Стратэгія перамогі».
**11.00 Маст. фільм «Госфард-парк».**
**13.00** Кінамарафон.
**16.30** Мультпарад.
**17.00 Серыял «Два капітаны».**
**18.20 Серыял «Справядлівая справа».**
**19.10** «Мой любімы гадаванец».
**19.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** Інфармбюро «Міжнароднае».
**21.10 Маст. фільм «Вендэта».**
**23.20 Серыял «Духі продкаў».**

**РОССИЯ**
**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**9.10** «Рускія без Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25, 14.20** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.45** «Кнот».
**13.05 Серыял «Чужыя тайны».**
**14.30 Камедыя «Асляплены жаданнямі».**
**16.05 Серыял «Рамэо і Джульета».**
**17.30** «Смяяцца дазваляецца».
**19.20 Дэтэктыў «Вяртанне Тытаніка».**
**22.05** «Семнаццаць імгненняў».
**22.25** «У Гарадку».
**23.10** Весткі+.
**23.20 Баявік «Пусціць пад адхон».**

**РТР ПЛАНЕТА**
**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**10.00, 17.25, 0.25 Серыял «Гонка за шчасцем».**
**10.50, 18.15, 1.10 Серыял «Жанчына без мінулага».**
**11.30 Маст. фільм «Самагубца».**
**13.00, 16.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**13.20** Весткі—Масква.
**13.35 Маст. фільм «Хто паедзе ў Трускавец».**
**14.50** «Тых, што загінулі, лічу больш храбрымі». Міхаіл Глузскі.
**15.20** «Сяргей Коласаў. Рэжысёр свайго лёсу».
**16.30** Весткі—Маскоўская вобласць.
**16.45, 0.10, 6.40** Весткі—спорт.
**16.55, 5.40** «Пра арт».
**19.45, 1.55 Серыял «Мачаха».**
**20.30, 3.45 Серыял «Мы з будучыні».**
**21.15, 4.50** «Цягнікі, якія выйгралі вайну».
**22.00** Весткі—Санкт-Пецярбург.
**22.20** «Жыў на свеце Маршак Самуіл».
**23.05, 4.30** Весткі+.
**23.20, 2.40** Навіны культуры.
**23.40, 6.10** «Начны палёт».

**НТВ Беларусь**
**6.00** «Сёння раніцай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00** Сёння.
**8.35** «Злачынства ў стылі мадэрн».
**9.05 Серыял «Адвакат».**
**10.20** «Галоўны герой».
**11.20, 19.45 Серыял «Афганскі прывід».**
**13.25, 22.30 Серыял «Эшалон».**
**15.05** «Прафесія — рэпарцёр».
**15.35, 18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**

**ТВ ЦЕНТР**
**5.00** Канал «Настрой».
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 18.50, 19.30** Падзеі.
**7.45, 10.15, 0.15** Пятроўка, 38.
**7.55 Дэтэктыў «Куфэрак Марыі Медычы».**
**9.45** «Дэтэктыўныя гісторыі». «Выкрадзеныя жыцці».
**10.45, 13.45** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**10.50 Серыял «Алька».**
**12.50** «Музычная гісторыя». Эдзіта П'еха.
**13.50** Небяспечная зона.
**14.30 Серыял «Закон Вольфа».**
**15.30** Новая «Часінка».
**16.55** Дзелавая Масква.
**17.15** Марына Голуб у праграме «Запрашае Б. Ноткін».
**17.45 Серыял «Мужчынская работа-2».**
**18.55** «Маскоўскія профі». Рыэлтары.
**20.00 Маст. фільм «Пад ліўнем куль».**
**22.05** Момант ісціны.
**23.00** Падзеі. 25-я гадзіна.
**23.30** «Нічога асабістага». Чытаць і не чытаць.
**0.40 Маст. фільм «Травесці».**
**2.10 Серыял «Закон Вольфа».**
**3.00 Маст. фільм «Камандзір карабля».**
**4.40** «Дабрыня Нікіціч». Мультфільм.

**EUROSPORT**
**9.30** Мотаспорт па выхадных.
**9.45** Мотагонкі. Гран-пры Кітая.
**11.30, 15.00, 20.30** Снукер. Чэмпіянат свету.
**13.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-17).
**19.00, 0.30** Футбол. Еўрагалы.
**19.45, 1.15** Футбол. «На шляху да «Еўра-2008».
**20.00** «Вікінг».
**1.30** Байцоўскі клуб.

### 16.25 ФІЛЬМ ДНЯ

### «НЕЧАКАНАЯ РАДАСЦЬ» (РАСІЯ, 2005 г.)

Лірычная камедыя аб узаемаадносінах розных пакаленняў, поглядаў, інтарэсаў, дзе звязваючым звяном з'яўляецца мілы добры сабака Епіфаній.

**Рэжысёр** — Марцірас Фанасян. **У ролях:** Надзея Румянцава, Валянціна Цітова, Армен Джыгарханян.



## І так бывае...

## У суд... з-за музыкі ў заапарку

**У суд Кастрычніцкага раёна Віцебска звярнуўся грамадзянін, які патрабуе, каб у віцебскім заалагічным парку не гучала музыка. На яго погляд, музычныя творы, што гучаць на тэрыторыі парку праз дынамікі, перашкаджаюць адпачываць наведвальнікам заапарку і спакойна назіраць за жывёламі.**

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзела культуры Віцебскага гарвыканкама Віктар Кібісаў, спачатку гэты чалавек звярнуўся з пісьмовым зваротам, дзе выказаў незадаволенасць. У выніку ўзровень гуку быў зменшаны, пра што гаварылася ў афіцыйным адказе, накіраваным яму. Але ж... Цяпер у сярэдзіне мая адбудзецца ўнікальнае судовае пасяджэнне.

Дырэктар віцебскага заапарку Аляксей Андрэйкаў, адказваючы карэспандэнту «Звязды» адзначыў, што цяпер вывучаюцца думкі наведвальнікаў па «музычным пытанні».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## АЎТОРАК, 6 МАЯ

**6.40** Меладрама «Транзіт».
**8.50** Слова Мітрапаліта Філарэта на Радаўніцу.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.05** Час спорту.
**9.30 Маст. фільм «Хлопчыкі».**
**11.05** «Когда замолкла сегидилья». Дак. фільм пра А.П. Александроўскую.
**12.10 Драма «Чыстае неба».**
**14.15** «Летапіс часоў».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.25 Драма «Танцы ў час Луназы».**
**17.10** «Гонар маю». Канцэрт памяці Аляксандра Лягчылава.
**18.35 Дэтэктыў «Пункт вяртання».**
**21.00** Панарама.
**21.40** Хакей для ўсіх.
**22.25** Хакей. Чэмпіянат свету. Канада—ЗША.
**0.45 Драма «Боскае святло».**

**7.00** «Наша раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30, 3.00, 5.00** Нашы навіны.
**9.05** Чакай мяне.
**10.00 Маст. фільм «Зялёны фургон».**
**12.30** «Малахаў+».
**13.30** «Белыя росы». Канцэрт.
**16.10, 20.55, 3.20** Навіны спорту.
**16.15 Серыял «Дыверсант».**
**21.00 Серыял «Разведчыкі. Апошні бой».**
**23.25** «Уладзімір Этуш. Усё, што нажыта непасільнай працай».
**0.30 Драма «Птаха».**
**2.30** Шукальнікі. «Скарбы Кёнігсберга».
**3.25 Баявік «Гонар і лютасць».**
**5.05** «Пантанал — царства вады». Дак. фільм.

**ЛАД**
**7.35** Мір вашаму дому.
**7.45** Мультсерыял «Звычайны Норман».
**8.10, 16.00** «Смачна з Барысам Бурдой».
**8.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**9.40 Кінааповесць «Ты памятаеш».**
**11.15** Спектакль «Паведамленне Марыі».
**14.00** «Лабірынты: на ростанях».
**14.30** Дак. фільм «Уладзімірскія».
**14.55** Слова пісьменніка.
**15.30** Святло далёкай зоркі. Іосіф Вейняровіч.
**16.35 Драма «Лермантаў».**
**18.30 Серыял «Чалавек вайны».**
**19.35 Кінараман «Каханне зямное».**
**21.25 Кінараман «Лёс».**
**0.30** Хакей. Формула гульні.

**ТВ РЕН**
**6.35** Анфас.
**6.50** «Сталічны футбол».
**7.20 Драма «Белы Бім Чорнае Вуха».**
**10.30** «Радаўніца».
**10.45** «Ecce homo».
**11.15 Маст. фільм «Паднятая цаліна».**
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Наш дом».
**17.05** «Званая вячэра».
**18.00 Меладрама «З каханымі не расставайцеся».**
**20.00 Фільм-драма «Жыццё ў ружовым святле».**
**22.30** «Рэпарцёр СТБ».
**23.00** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**23.10** «Гарачы лёд».
**23.40** «Надзвычайныя гісторыі».

**Мир**
**5.00, 6.15, 7.00, 1.00** Садружнасць live.
**5.30, 14.30 Серыял «ОБЖ».**
**6.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**6.45** Камерцыйная праграма.
**7.30** «Рэспубліка сёння».
**8.00, 18.45 Серыял «Афіцэры».**
**9.15** «Хіт-экспрэс».
**10.15** «Суседзі».
**10.30 Серыял «Дзікі месяц».**
**11.30** «Пра каханне. Першыя сустрэчы».
**12.15** Студыя 60х90.
**12.25, 22.25 Маст. фільм «Сказ пра маці».**
**14.15** «Вучым англійскую».
**15.25, 0.05** Дак. серыял «Вы гэта бачылі?».
**16.25, 1.30** «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
**17.25, 2.30** «Лепшае з Джэнтльмен-шоў».
**18.25** «Акцэнты».
**19.45** «Памяць». «Жалезны сведка па імені Максім».
**20.00** «Спрэчная тэрыторыя».
**21.25 Серыял «Чорны спіс».**

**ВосьМой**
**7.00, 18.15, 19.10** «К-гульні».
**7.10, 10.55, 23.30** «Метэапрагноз».
**7.15 Маст. фільм «Калі дрэвы былі вялікімі».**
**8.50, 19.30, 23.25** «Навіны кіно».
**9.00** «Клуб 700».
**9.30, 16.30** «Мультпарад».
**9.45** Дак. серыял «Стратэгія перамогі».
**10.50** Інфармбюро «Міжнароднае».
**11.00 Маст. фільм «Вендэта».**
**13.00** Кінамарафон.
**17.00 Серыял «Два капітаны».**
**18.20 Серыял «Справядлівая справа».**
**19.15** «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
**19.40 Серыял «Я кахаю цябе так моцна, што магу забіць».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Зялёны дом».
**21.15 Маст. фільм «Сімона».**

**РОССИЯ**
**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**9.10** «Рускія без Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25, 19.25** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.40** Пакой смеху.
**12.35** «Семнаццаць імгненняў».
**12.55 Серыял «Чужыя тайны».**
**13.50, 16.50** Весткі—Беларусь.
**14.20 «Кулагін і партнёры».**
**14.55** Суд ідзе.
**15.50 Серыял «Рамэо і Джульета».**
**17.30** Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
**17.40** Юбілейны канцэрт Аляксандры Пахмутавай.
**19.45 Камедыя «Аксамітныя ручкі».**
**21.40 Маст. фільм «Кола лёсу».**
**23.35 Маст. фільм «Вішнёвыя ночы».**

**РТР ПЛАНЕТА**
**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**10.00, 17.25, 0.25 Серыял «Гонка за шчасцем».**
**10.45, 18.15, 1.10 Серыял «Жанчына без мінулага».**
**11.30** «Жыў на свеце Маршак Самуіл».
**12.10, 20.30, 3.45 Серыял «Мы з будучыні».**
**13.00, 16.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**13.20** Весткі—Масква.
**13.35** Святочны канцэрт, прысвечаны Дню Радыё.
**14.45** «Я не люблю разблытваць вузлы». Э. Быстрыцкая чытае вершы Ю. Друнінай.
**15.15** «Смяротны таран. Праўда пра Мікалая Гастэла».
**16.30** Весткі—Маскоўская вобласць.
**16.45, 0.10, 6.40** Весткі—спорт.
**16.55, 5.40** «Легенды сусветнага кіно». Людміла Цалікоўская.
**19.45, 1.55 Серыял «Мачаха».**
**21.15, 4.50** «Жаночы твар вайны. «Кацюша».
**22.00** Весткі—Санкт-Пецярбург.
**22.20** «Апокрыф».
**23.05, 4.30** «Весткі+».
**23.20, 2.40** Навіны культуры.
**23.40, 6.10** «Начны палёт».

**НТВ Беларусь**
**6.00** Сёння раніцай.
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00** Сёння.
**8.35** «Дзікі свет».
**9.05 Серыял «Адвакат».**
**9.55** «Асарці».
**10.20** «Ядзім дома!»
**10.55** «Quattroruote».
**11.25, 19.45 Серыял «Афганскі прывід».**
**13.25, 22.30 Серыял «Эшалон».**
**15.05** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**15.35, 18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**

**ТВ ЦЕНТР**
**5.00** Канал «Настрой».
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 18.50, 19.50** Падзеі.
**7.45, 10.15, 2.10** Пятроўка, 38.
**7.55, 10.45, 13.45** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**8.00 Маст. фільм «Зігзаг удачы».**
**9.45** «Доказы віны». «Барабан».
**10.50 Серыял «Алька».**
**12.55** «Музычная гісторыя». Іосіф Кабзон.
**13.50** Нашы любімыя жывёлы.
**14.30, 2.30 Серыял «Закон Вольфа».**
**15.30** Новая «Часінка».
**16.55** Дзелавая Масква.
**17.15** «21 кабінет».
**17.45 Серыял «Мужчынская работа-2».**
**18.55** Тварам да горада.
**20.05 Маст. фільм «Пад ліўнем куль».**
**22.15** «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. «Прадаецца кватэра з бабуляй».
**23.05** Падзеі. 25-я гадзіна.
**23.35** «Нацыянальны здабытак». Уладзімір Этуш.
**0.20 Маст. фільм.**
**3.35 Маст. фільм «Агент у міні-спадніцы».**

**EUROSPORT**
**9.30, 20.30, 1.30** Футбол. «На шляху да «Еўра-2008».
**9.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-17).
**11.45, 19.00, 1.45** Футбол. Еўрагалы.
**12.30, 0.00** Снукер. Чэмпіянат свету.
**14.45, 19.15** Тэніс. Турнір WTA.
**20.00** Вось гэта дзіва!
**20.45** Бокс.

### 15.25 ФІЛЬМ ДНЯ

### «ТАНЦЫ Ў ЧАС ЛУНАЗЫ» (ІРЛАНДЫЯ, 1998 г.)

1936 год, Грамадзянская вайна ў Іспаніі... Але на поўдні Ірландыі ўсе рыхтуюцца да штогадовага свята — «Танцаў ў час Луназы». Прыезд слаўнага, добрага старога, які ўжо ўпадае ў дзяцінства і не здольны клапаціцца аб сабе, прабуджае ў людзях вулкан страсцяў.

**Рэжысёр** — Пэт О'Конар. **У ролях:** Мерыл Стрып, Майкл Гэмбан, Кэтрын МакКормак.



## У Беларусі змяніліся БПМ, дзіцячыя дапамогі і некаторыя віды пенсій

**Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, вызначаны новыя памеры пражытковага мінімуму ў цэнах сакавіка. У прыватнасці, з 1 мая «сярэдні» БПМ на кожнага члена сям'і з 4 чалавек складае 209 680 рублёў.**

У параўнанні з папярэднім паказчыкам рост сярэдняга бюджэту прыжытковага мінімуму складзе амаль 4,8 працэнта. Адпаведна, прыкладна на столькі ж павялічацца памеры мінімальных і сацыяльных пенсій. Так, паводле слоў начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Валянціны Каралёвай, з 1 мая мінімальная пенсія павысіцца з 50 020 да 52 420 рублёў, а выдаткі Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на пенсійныя выплаты — на 2,6 мільярда.

Адначасова ў сувязі са змяненнем БПМ адбудзецца і пераразлік дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Як паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва міністэрства Таццяна Шэметавец, з 1 мая штомесячная дапамога на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў складзе 167 740 рублёў, аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці — 1 млн 48 400 рублёў, а аднаразовая дапамога пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 1 млн 467 760 рублёў.

**Сяргей ГРЫБ.**

## СЕРАДА, 7 МАЯ

**5.25** «Нечаканы цырк».
**6.20, 7.10, 8.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**6.45, 7.45** Зона Х.
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**7.30** Дзелавое жыццё.
**8.20** Гатуем разам.
**8.30** «Бабулькі не старэнькія».
**9.05** «Нарадзіўся я ліцьвінам». Дак. фільм.
**10.00, 16.50 Серыял «Родныя людзі».**
**10.50, 17.45 Серыял «Сэрцу не загадаеш».**
**11.45** «Калі за справу бярэцца каманда».
**12.10 Драма «Жывыя і мёртвыя».**
**14.00** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**14.45** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30 Серыял «Вось так!».**
**15.55 Серыял «Тайны следства».**
**18.50, 0.20** Зона Х.
**19.35** Зямельнае пытанне.
**19.55 Драма «Бой мясцовага значэння».**
**21.00** Панарама.
**21.45 Драма «Тэлевіктарына».**
**0.25** Дзень спорту.
**0.35 Серыял «Вось так!».**
**1.05** Хакей для ўсіх.
**1.55** Хакей. Чэмпіянат свету. Францыя — Беларусь.

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.25, 3.00, 5.00** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Нараджэнне легенды. «Мiміно».
**10.00** Серыял «Мая цудоўная нянька».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.40, 3.20** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.00** «Малахаў+».
**13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**14.10** «Людзі ў чорным».
**14.30** «Кантрольная закупка».
**15.05 «Дачка садоўніка». Серыял.**
**16.15 «Агонь кахання». Серыял.**
**17.10, 5.05** «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
**18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.**
**18.55 «Таццянін дзень». Серыял.**
**20.00** Час.
**21.05 «Разведчыкі. Апошні бой». Серыял.**
**23.45** «Тэорыя неверагоднасці».
**0.35** «Бразільскі футбол на АНТ».
**3.25 «Каварства гор». Серыял.**
**4.15** «Маё жыццё і я». Серыял.

**ЛАД**
**6.45** Мультсерыял «Звычайны Норман».
**7.10** Ранішняя падзарадка.
**8.10, 16.50** «Смачна з Барысам Бурдой».
**8.45 Серыял «Чалавек вайны».**
**9.35** У гэты дзень.
**9.40** Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
**10.25** Дак. фільм «Статысты: па той бок экрана».
**11.20 Серыял «Непрыгожая Бэці».**
**12.10** Хакей. Формула гульні.
**12.35** «Цудоўная сямёрка». Эпізод шосты.
**13.30** «Яго вялікасць Эфір». Канцэрт.
**15.20** Мультсерыял «Звычайны Норман».
**15.45** Пазакласная гадзіна.
**15.55** Невытлумачальна, але факт.
**17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».**
**18.35** Навіны культуры.
**18.50 Серыял «Чалавек вайны».**
**19.55** Калыханка.
**20.15** Беларуская часінка.
**21.20** Нянька спяшаецца на дапамогу.
**22.20 Серыял «Уладар эфіру».**
**0.05** Баскетбол. НБА. Матч плей-оф.

**ТВ РЕН**
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 7.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**8.30, 16.50 «Афрамасквіч». Серыял.**
**9.00** «Акадэмік Ігнат Антонаў. Чалавек-легенда».
**10.00** «Гарачы лёд»:
**10.40** «Аўтапанарама».
**11.00, 15.30, 23.00** «Крутыя рабяты».
**11.10 «Рэбека». Серыял.**
**12.00, 18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.**
**12.50** «Наша справа».
**13.00** «Рэпарцёр СТБ».
**13.50** «Чэмпіянат свету па ралі». Іарданія.
**14.40** «Гаргуллі». Мультсерыял.
**15.00 «Элен і сябры». Серыял.**
**15.40** «Прыватныя гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**20.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30** «Скардзіцца дазволена».
**20.55 «Салдаты 14». Серыял.**
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.10 «Баец». Серыял.**
**0.00** «Закон і крымінал».
**0.05** «Рэактыўны бокс».
**0.35** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**1.25 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.**

**Мир**
**5.00, 6.15, 7.00, 1.00** Садружнасць live.
**5.30, 14.30 Серыял «ОБЖ».**
**6.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**6.45** Камерцыйная праграма.
**7.30** «Агульны інтарэс».
**8.00, 18.45 Серыял «Афіцэры».**
**9.15, 20.00** «Спрэчная тэрыторыя».
**10.15** «Дзень пасла».
**10.30 Серыял «Дзікі месяц».**
**11.30, 0.30** Дак. серыял «Следчыя і экстрасэнсы».
**12.15** «Студыя 60х90».
**12.25, 22.25 Маст. фільм «Сустрэча на Эльбе».**
**14.15** «Вучым англійскую».
**15.25, 0.05** Дак. серыял «Жывёлы на здымачнай пляцоўцы».
**15.50** «Планета VISION прадстаўляе».
**16.25, 1.30** «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
**17.25, 2.30** «Лепшае з Джэнтльмен-шоў».
**18.25** «Акцэнты».
**19.45** «Памяць». «Рус — здавайся!».
**21.25 Серыял «Чорны спіс».**

**ВосьМой**
**7.00** «Навіны кіно».
**7.10, 10.55, 21.05, 23.30** «Метэапрагноз».
**7.15 Маст. фільм «Да мяне, Мухтар!».**
**9.00** «К-відэа» для дзяцей.
**9.30** «Адшукваецца адпачынак».
**9.45** Дак. серыял «Стратэгія перамогі».
**11.00 Маст. фільм «Сімона».**
**12.30** «Дзённы тэлечат».
**16.30** Мультпарад.
**17.00 Серыял «Два капітаны»**
**18.30 Серыял «Справядлівая справа».**
**19.15** «Хіт-парад тэлечата».
**19.40 Серыял «Я кахаю цябе так, што магу забіць».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** Інфармбюро «Міжнароднае».
**21.10 Маст. фільм «Выкрадальнікі».**
**23.00 Серыял «Духі продкаў».**

**РОССИЯ**
**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**9.10** «Рускія без Расіі».
**10.10** Уся Расія.
**10.40** Урачыстая цырымонія заняцця пасады Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Д.А. Мядзведзевым.
**11.40** «Крэмль. Захавальнікі скарбніцы Расіі».
**12.55 Серыял «Чужыя тайны».**
**13.50, 16.50, 18.50, 23.00** Весткі—Беларусь.
**14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** Суд ідзе.
**15.50 Серыял «Рамэо і Джульета».**
**17.30** Святочны канцэрт, прысвечаны Дню радыё.
**19.45 Серыял «Дзве сястры».**
**20.50** Добрай ночы, малыя!
**21.00 Серыял «Канвой PQ-17».**
**22.05 Серыял «Закон і парадак».**
**23.00** Весткі—Беларусь.
**23.10** Весткі+.
**23.30** «Жаночы твар вайны. «Кацюша».

**РТР ПЛАНЕТА**
**7.00** «Добрай раніцы, Расія!».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**10.20** Весткі—Масква.
**10.40** Урачыстая цырымонія заняцця пасады Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Д. А. Мядзведзевым.
**11.45** «Айчына і лёсы».
**12.10, 20.30, 3.45 Серыял «Мы з будучыні».**
**13.20** Весткі—Масква.
**13.35 Маст. фільм «Адзін і без зброі».**
**14.45** Мультфільмы.
**15.15** «Крэмль. Захавальнікі скарбніцы Расіі».
**16.30** Весткі—Маскоўская вобласць.
**16.45, 0.10, 6.40** Весткі-спорт.
**16.55, 5.40** «Хто там...».
**17.25, 0.25** «Гонка за шчасцем». Серыял.
**18.15, 1.10 «Жанчына без мінулага». Серыял.**
**19.45, 1.55 Серыял «Мачаха».**
**21.15, 4.50** «Маршалы перамогі: Жукаў і Ракасоўскі».
**22.20** «Білет у Вялікі».
**23.05, 4.30** « Весткі+».
**23.20, 2.40** Навіны культуры.
**23.40, 6.10** «Начны палёт».

**НТВ Беларусь**
**6.00** «Сёння раніцай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00** Сёння.
**8.35** «Злачынства ў стылі мадэрн».
**9.05 Серыял «Адвакат».**
**10.20** «Іх норавы».
**10.55** «Галоўная дарога».
**11.25, 19.45 Серыял «Афганскі прывід».**
**13.30, 22.30 Серыял «Эшалон».**
**15.05** «Асарці».
**15.35, 18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**

**ТВ ЦЕНТР**
**5.00** Канал «Настрой».
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 18.50, 19.30** Падзеі.
**7.45, 10.15, 2.00** Пятроўка, 38.
**7.55 «Дзявочая вясна». Маст. фільм.**
**9.55** «Рэпарцёр».
**10.40** Урачыстая цырымонія заняцця пасады Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Д. А. Мядзведзевым.
**11.30 «Пад ліўнем куль». Маст. фільм.**
**13.45** Дзень бусла.
**14.05** «Дабрыня Мікіціч». Мультфільм.
**14.30, 2.20 «Закон Вольфа». Серыял.**
**15.30** Новая «Часінка».
**16.55** «Рэзананс».
**17.15** Сялянская застава.
**17.45 «Мужчынская работа-2». Серыял.**
**18.55** «Схаваная пагроза». Спецыяльны рэпартаж.
**20.00 «Неслужбовае заданне». Маст. фільм.**
**21.55** «Справа прынцыпу».
**22.50** Падзеі. 25-я гадзіна.
**23.20** «Вырашыце за мяне». Ток-шоў.
**0.10 Ігар Ліфанаў у баевіку «Парадыз».**
**3.15** «Зігзаг удачы». Маст. фільм.

**EUROSPORT**
**9.30** Вось гэта дзіва!!!
**9.45, 18.45** Футбол. Еўрагалы.
**10.30** Футбол. «На шляху да Еўра-2008».
**10.45** Снукер. Чэмпіянат свету.
**13.00, 19.00** Тэніс. Турнір WTA.
**17.00, 20.00, 1.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-17).
**21.45. 0.40** Выбранае па серадах.
**21.55** Конны спорт.
**23.00** Гольф.
**0.35** Яхт-клуб.
**0.45** «Алімпійскія гульні».

### 19.55 ФІЛЬМ ДНЯ

### «БОЙ МЯСЦОВАГА ЗНАЧЭННЯ» (РАСІЯ, 2008 Г.)

Канец 1943 года... Група трафейшчыкаў пад камандаваннем юнага лейтэнанта з'яўляецца ў глухой вёсцы, якую вайна цудам абышла бокам. Але на наступны дзень у вёску ўваходзіць атрад адборных дыверсантаў СС.

**Рэжысёр** — Аляксей Казлоў.

**У ролях:** Мікалай Дабрынін, Аляксей Бардукоў, Аляксей Зубкоў.



## ЧАЦВЕР, 8 МАЯ

**5.30, 15.55 Серыял «Тайны следства».**
**6.20, 7.05, 8.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**6.45, 7.45** Зона Х.
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**7.30, 8.30** Дзелавое жыццё.
**8.20** Гатуем разам!
**8.35** Зямельнае пытанне.
**9.05, 19.55 Драма «Бой мясцовага значэння».**
**9.55** Хакей. Чэмпіянат свету. Францыя — Беларусь.
**12.15 Маст. фільм «Жывыя і мёртвыя».**
**14.00** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**14.45** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Вось так!».**
**16.50 Серыял «Родныя людзі».**
**17.45 Серыял «Сэрцу не загадаеш».**
**18.50** Зона Х.
**19.35** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.40 Трагікамедыя «Жыццё цудоўнае».**
**0.05** Дзень спорту.
**0.15 Трылер «Бяссонніца».**

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 0.35, 3.00, 5.00** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05, 18.55 «Таццянін дзень». Серыял.**
**10.00 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 0.50, 3.20** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.00** «Малахаў+».
**13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**14.10** «Людзі ў чорным».
**14.30** «Кантрольная закупка».
**15.05 «Дачка садоўніка». Серыял.**
**16.15 «Агонь кахання». Серыял.**
**17.10** «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
**18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.**
**20.00** Час.
**21.05** «Радзіма Перамогі — СССР».
**0.55 Маст. фільм «Свае».**
**3.30—5.00** Тэхнічная прафілактыка.
**5.05** Музычная калекцыя.
**6.05** «Апошняе каханне Мікалая Кручкова».

**ЛАД**
**6.45, 14.00** Мультсерыял «Звычайны Норман».
**7.10** Ранішняя падзарадка.
**8.10, 16.00** «Смачна з Барысам Бурдой».
**8.45 Серыял «Чалавек вайны».**
**9.35** У гэты дзень.
**9.40, 16.35** Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
**10.25** Слова пісьменніка.
**10.55, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».**
**11.55 Серыял «Непрыгожая Бэці».**
**12.40** «Тэатр. Выбранае...» Артыст Аляксандр Ждановіч.
**13.10** «Спорт, спорт, спорт...» Ларыса Лук'яненка.
**13.40** Анекдот. LAD.
**14.25** Мультфільмы.
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.05** «Касмапалітэн».
**18.35** Навіны культуры.
**18.50 Серыял «Чалавек вайны».**
**19.55** Калыханка.
**20.15** Беларуская часінка.
**21.20** «Цудоўная сямёрка».
**21.55 Меладрама «Кірмаш пыхлівасці».**
**0.25** Проста праграма.

**ТВ РЕН**
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**8.30, 16.50 «Афрамасквіч». Серыял.**
**9.00, 20.55 «Салдаты 14». Серыял.**
**10.00** «Рэактыўны бокс».
**10.40** «Скардзіцца дазволена».
**11.00, 15.30, 23.00** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**11.10 «Рэбека». Серыял.**
**12.00, 18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.**
**12.50** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**13.00** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** «Паспець усё».
**14.40** «Гаргуллі». Мультсерыял.
**15.00 «Элен і сябры».**
**15.40** «Фантастычныя гісторыі».
**17.30** «Званая вячэра».
**20.05, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30** «Аўтапанарама».
**22.00** «Асабісты інтарэс».
**23.10** «Сталкер».
**23.40** «Закон і крымінал».
**23.45 Маст. фільм «Сволачы».**
**1.35** «Сакрэтныя матэрыялы».

**Мир**
**5.00, 6.15, 7.00, 1.00** Садружнасць live.
**5.30, 14.30 Серыял «ОБЖ».**
**6.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**6.45** Камерцыйная праграма.
**7.30** «Руская версія».
**8.00, 18.45 Серыял «Афіцэры».**
**9.15, 20.00** «Спрэчная тэрыторыя».
**10.15** «Тэрыторыя KG».
**10.30 Серыял «Дзікі месяц».**
**11.30** «Жаночы часопіс».
**12.15** «Студыя 60х90».
**12.25, 22.25 Маст. фільм «Нядзеля ў пекле».**
**14.15** «Вучым англійскую».
**15.25, 0.15** Дак. серыял «Машыны-монстры».
**16.25, 1.30** «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
**17.25, 2.30** «Лепшае з Джэнтльмен-шоў».
**18.25** «Акцэнты».
**19.45** «Памяць». «Двойчы пахаваны».
**21.25 Серыял «Чорны спіс».**

**ВосьМой**
**7.00, 19.10, 21.15** «К-гульні».
**7.10, 10.55, 23.35** «Метэапрагноз».
**7.15 Маст. фільм «Старэйшая сястра».**
**8.50, 10.40, 18.15, 23.25** «Навіны кіно».
**9.00** «Дом жывых гісторый».
**9.30, 16.30** Мультпарад.
**9.45** Дак. серыял «Стратэгія перамогі».
**10.50** Інфармбюро «Міжнароднае».
**11.00 Маст. фільм «Выкрадальнікі».**
**12.45** «Дзённы тэлечат».
**17.00 Серыял «Два капітаны».**
**18.20 Серыял «Справядлівая справа».**
**19.15** «Мой любімы гадаванец».
**19.30 Серыял «Хлеб і цюльпаны».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
**21.20 Маст. фільм «Я марыла аб Афрыцы».**

**РОССИЯ**
**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**9.00** «Пугачова, Распуціна... Усе зоркі Дзербянёва».
**9.50 Серыял** «Дзве сястры».
**10.45** Весткі. Дзяжурная часць.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25, 19.25** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.45, 21.00 Серыял «Канвой PQ-17».**
**12.45** «У Гарадку».
**12.55 Серыял «Чужыя тайны».**
**13.50, 16.50, 18.50, 23.00** Весткі—Беларусь.
**14.20 «Кулагін і партнёры».**
**14.55** Суд ідзе.
**15.50 Серыял «Рамэо і Джульета».**
**17.30** Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
**17.50 «Жанчына без мінулага». Серыял.**
**19.45 Серыял «Дзве сястры».**
**20.50** Добрай ночы, малыя!
**22.05 Серыял «Закон і парадак».**
**23.10** «Маршалы Перамогі: Жукаў і Ракасоўскі».

**РТР ПЛАНЕТА**
**7.00** «Добрай раніцы, Расія!».
**10.00, 17.25, 0.25 «Гонка за шчасцем». Серыял.**
**10.45, 18.15, 1.10 «Жанчына без мінулага». Серыял.**
**11.30, 20.35, 3.45 Серыял «Мы з будучыні».**
**13.00, 16.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**13.20** Весткі—Масква.
**13.35 Маст. фільм «Самы марудны цягнік».**
**14.50** Мультфільмы.
**15.15, 1.55** «Мой сярэбраны шар. Віктар Паўлаў».
**16.30** Весткі—Маскоўская вобласць.
**16.45, 0.10, 6.40** Весткі-спорт.
**16.55, 5.40** «БлакНОТ».
**19.45, 4.50** «Тры вальсы». Клаўдзія Шульжэнка.
**21.20** Весткі—Санкт-Пецярбург.
**21.35** Юбілейны канцэрт Надзеі Кадышавай.
**2.40** Навіны культуры.
**6.10** «Начны палёт».

**НТВ Беларусь**
**6.00** «Сёння раніцай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.30, 10.55** «Злачынства ў стылі мадэрн».
**8.55 Серыял «Адвакат».**
**9.45, 15.15** «Асарці».
**10.25** «Усё адразу!».
**11.20 Серыял «Афганскі прывід».**
**13.30 Серыял «Эшалон».**
**15.30, 18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**
**19.45 Маст. фільм «Адзін дзень».**
**21.45 Драма «Вялікі рэйд».**

**ТВ ЦЕНТР**
**5.00** Канал «Настрой».
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 18.50, 19.30** Падзеі.
**7.45, 10.15, 0.50** Пятроўка, 38.
**7.55 «Сярод добрых людзей». Маст. фільм.**
**9.35** Людміла Гурчанка. «Песні вайны».
**10.45 «Пад ліўнем куль». Маст. фільм.**
**12.55** «Музычная гісторыя». Леў Лешчанка.
**13.45** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**13.50** Марш-кідок.
**14.30 «Закон Вольфа». Серыял.**
**15.30** Новая «Часінка».
**16.55** Дзелавая Масква.
**17.15** «Фактар жыцця».
**17.45 «Мужчынская работа-2». Серыял.**
**18.55** «Краіна запаветаў». Спецыяльны рэпартаж.
**20.00 «Выбух на досвітку». Маст. фільм.**
**21.45** «Народ хоча ведаць». Ток-шоў.
**22.50** Падзеі. 25-я гадзіна.
**23.20** «Вайна і мір Барыса Васільева». Дак. фільм.
**0.10 «Хроніка пікіруючага бамбардзіроўшчыка». Маст. фільм.**
**1.45 «Дзявочая вясна». Маст. фільм.**
**3.40** «Схаваная пагроза». Спецыяльны рэпартаж.
**4.15 «Неслужбовае заданне». Маст. фільм.**

**EUROSPORT**
**9.30** «Алімпійскія гульні».
**10.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-17).
**12.00, 19.15** Тэніс. Турнір WTA.
**19.00** Футбол. Еўрагалы.
**20.00** Футбол. Класіка лігі чэмпіёнаў.
**22.00** Бокс.
**0.00** Байцоўскі клуб.

### 21.40 ФІЛЬМ ДНЯ

### «ЖЫЦЦЁ ЦУДОЎНАЕ» (ІТАЛІЯ, 1997 Г.)

Любячы бацька выкарыстоўвае ўсё сваё смелае ўяўленне і непахісны дух дзеля тых, каго ён любіць. Ён расказвае сыну што ўсё, што адбываецца, — вялікая гульня за прыз (сапраўдны танк), які дастанецца таму хлопчыку, які зможа не папасціся на вочы наглядчыкам. Ён зрабіў усё, каб сын паверыў у гэта і застаўся жывы, хаваючыся ў бараку...

**Рэжысёр** — Раберта Беніні. **У ролях:** Раберта Беніні, Нікалета Браскі, Марыса Парэдэс.



# ЛЕГЕНДА МІНСКАГА МЕТРО СВЯТКУЕ ЮБІЛЕЙ



**Пятага мая Тунэльнаму атраду № 1, які належыць да ўнітарнага прадпрыемства «Мінскметрабуд», спаўняецца 55 гадоў. Свята вялікае не толькі для яго работнікаў — гэта падзея гучная для ўсіх людзей, якія і кожны дзень, і хоць бы раз у жыцці карысталіся метро. Уявіце сабе, менавіта праходчыкі, наладчыкі, мантажнікі Тунэльнага атрада № 1 пачыналі будаваць наш, мінскі метрапалітэн. Дзякуючы працы гэтых людзей, усяго калектыву атрада, падземныя лініі аднаўляюцца новымі станцыямі і па сёння. Работа — рыццё катлаванаў, пакарэнне пароды пад зямлёй — ідзе без перапынкаў, і цяпер, і ў 1977 годзе, калі 4 лютага Савет Міністраў СССР прыняў пастанову «Аб будаўніцтве метрапалітэна ў горадзе Мінску». Ужо ў маі таго ж года ў Мінск прыбыла група работнікаў Тунэльнага атрада № 1, 16 чэрвеня яна забіла першую палю катлавана станцыі «Парк Чалюскінцаў», а 4 лістапада пачалася праходка перагоннага тунэля «Парк Чалюскінцаў» — «Маскоўская».**

...Цікава, што гісторыя Тунэльнага атрада № 1 з самага пачатку з'яўляецца хронікай станаўлення, развіцця і будаўніцтва зусім розных аб'ектаў. Аб'ядноўвае іх тое, што ўсе мелі вельмі вялікае, першаснае значэнне для народнай гаспадаркі Савецкага Саюза. Па месцах, дзе пабываў атрад, можна смела вывучаць і геаграфію, і гісторыю былых рэспублік.

Арганізаваны ён быў у складзе «Галоўтунэльметрабуда» для выканання першай сваёй задачы — узвядзення тунэля Паўднёва-Сібірскай чыгуначнай магістралі, па лініі Абакан — Новакузнецк (Сталінск). У 1957 годзе Абаканскі тунэль працягласцю ў 2400 метраў быў пабудаваны. Калектыў, які заўсёды складаўся з прафесіяналаў сваёй справы, пачаў працаваць па ўсёй вялікай краіне. Пасля ўзвядзення чатырох тунэляў чыгуначнай лініі Шуш-Кія-Шалтыр, якія былі здадзены Дзяржаўнай камісіі на адзнаку «выдатна», пачаліся работы па стварэнні падземных будынкаў Чыркейскай гідраэлектрастанцыі ў Дагестанскай АССР. Дарэчы, менавіта там былі праведзены іспыты новых машын, пачалі ўкараняцца сучасныя на той час машыны і механізмы. Напрыклад, упершыню выкарысталі тэхналогію гладкага контурнага ўзрывання, былі ўжытыя самаходныя свідравальныя машыны, бязрэйкавы транспарт. Тунэльны атрад, такім чынам, ператварыў работу на гідраэлектрастанцыі ў эксперыментальную базу для тэхналогій.

Увогуле, пракладка тунэляў — дзейнасць вельмі спецыфічная, і таму запатрабаванасць у гэтых работах можа ўзнікнуць нават у месцах, далёкіх ад індустрыяльнага ўздзеяння чалавека. Так, у 1968 годзе Тунэльны атрад № 1 узяў удзел у работах па стварэнні для знакамітага вінсаўгаса Абраў-Дзюрсо падземнага вінасховішча ў Краснадарскім краі. Не ўсе ведаюць, але ў тыя часы каралева Вялікабрытаніі аддавала перавагу выключна шампанскаму Абраў-Дзюрсо маркі «брут». За два гады брыгады атрада зрабілі два вялізныя сховішчы даўжынёй па 200 метраў.

А потым, адразу ж пасля заканчэння «шампанскіх работ», работнікі пачалі шчыраваць над яшчэ адным аб'ектам. На гэты раз папрацавалі на патрэбу навукі. Так, у Кабардзіна-Балкарыі, на вышыні 1700 метраў над узроўнем мора, зусім каля Эльбруса, Тунэльны атрад № 1 пабудаваў для інстытута фізікі Акадэміі навук падземную лабараторыю для ўлоўлівання і вывучэння элементарных часціц нейтрына. Гэтыя работы працягваліся з канца 1960-х і ажно да 1978 года.

Адначасова другая частка калектыву знаходзілася і на яшчэ адным аб'екце. Трэба было пракласці тры кіламетры Лысагорскага тунэля. Работы былі арганізаваны з двух бакоў, і праходчыкі Паўднёвага і Паўночнага парталаў прасоўваліся насустрач адзін аднаму. Гэта быў час, калі працягвалі праводзіцца іспыты новага праходчага абсталявання.



Потым прыйшоў год 1977, у якім было прынята рашэнне, што ў Мінску будзе метро. З яго, можна лічыць, пачаўся новы адлік гісторыі Тунэльнага атрада. Людзі добра памятаюць, як у нашай сталіцы нараджаўся метрапалітэн — падзея была незвычайнай, радаснай. Адкрыццё кожнай новай станцыі сустракалі тысячы і тысячы шчаслівых людзей. І, як заўсёды, самыя адказныя і складаныя работы даверылі Тунэльнаму атраду № 1. Спачатку ён правёў 4,7 кіламетра трох новых станцый — «Парк Чалюскінцаў», «Акадэмія навук», «Кастрычніцкая». Потым, у 1984 годзе, пачалося будаўніцтва другой лініі — «Трактарны завод», «Фрунзенская». Дарэчы, гідрагеалагічныя ўмовы, пры якіх ажыццяўлялася праходжанне пад зямлёй, у некаторых месцах былі складанымі. Адначасова прыходзілася вырашаць яшчэ некалькі задач. Напрыклад, у час будаўніцтва першага ўчастка другой лініі было выканана замацаванне больш за дваццаці будынкаў, якія з'яўляліся ў асноўным помнікамі архітэктуры. Работнікам тунэльнага атрада спатрэбілася праявіць высокае майстэрства — напрыклад, праходка каля Кафедральнага сабора ажыццяўлялася ў непасрэднай блізкасці ад трыццаціпяціметровай званіцы. У час пракладкі метро была выкарыстана прагрэсіўная тэхналогія «сцяна ў грунце».

За трыццаць гадоў работы ў Мінску Тунэльны атрад №1, які ўваходзіць цяпер у структуру «Мінскметрабуда», пабудаваў дзесяць станцый метрапалітэна, выканаў праходку каля дваццаці кіламетраў перагонных тунэляў. І зараз, у час свайго юбілею, яго работнікі таксама працуюць няспынна, каб даць нашай сталіцы новыя станцыі метро.

Напярэдадні 55-годдзя Тунэльнага атрада № 1 мы сустрэліся з яго начальнікам Яўгенам ШУКАЕВЫМ.

**— Яўген Іосіфавіч, што робіць тунэльны атрад цяпер?**

— На сённяшні дзень тунэльны атрад займаецца работамі па праходжанні ўчастка ад станцыі «Інстытут культуры» да «Грушаўкі». Будуюцца тупікі за «Пятроўшчынай» і там жа вядуцца падрыхтоўчыя работы па ўзвядзенні непасрэдна станцыі. Адкрытым спосабам узводзіцца ўчастак на прымыканні да станцыі «Інстытут культуры», участак працягу першай лініі да «Пятроўшчыны». Праводзяцца і іншыя работы.

**— Колькі чалавек працуе на аб'ектах цяпер?**

— Давайце падлічым. Брыгада Ўладзіміра Лагуты ажыццяўляе праходку тунэляў ад «Грушаўкі» да «Інстытута культуры», там працуюць прыблізна 90 чалавек. Брыгада Аляксандра Цупрановіча займаецца будаўніцтвам тупікоў за станцыяй «Пятроўшчына», задзейнічаны каля шасцідзесяці работнікаў. Брыгада Аляксандра Грыня працуе адразу ж на двух аб'ектах — на адкрытым участку прымыкання да станцыі «Інстытут культуры», і на падаўжэнні станцыі «Уручча» ўзводзяць дадатковыя збудаванні. Усяго ў Тунэльным атрадзе працуе 290 чалавек.

**— А якім чынам, заўсёды было цікава, робяцца нясучыя канструкцыі?**

— Выкарыстоўваецца некалькі тэхналогій. Распаўсюджаны «палевы метад», сёння ён выкарыстоўваецца пры будаўніцтве «Пятроўшчыны». Спачатку забіваюцца ў катлаван палі, потым замацоўваюцца распоркі. Ёсць яшчэ тэхналогія «сцяна ў грунце», але апошнім часам станцыі пад яе выкарыстанне не праектуюцца.

**— Ваш калектыў выконвае амаль унікальныя работы, у суседніх краінах яго дзейнасць таксама была б вельмі карыснай?**

— Так, пачынаючы з 1987 года, і ажно па 1996-ы атрад працаваў яшчэ ў Сочы — на ўзвядзенні аўтадарогі «Адлер — Чырвоная Паляна». За гэты час пабудавалі два тунэлі даўжынёй 160 і 150 метраў. У гэты ж час прыклаў атрад свае сілы і да ўзвядзення маскоўскага метро, адкрытым спосабам былі пабудаваны ўчасткі перагонных тунэляў паміж станцыямі «Цёплы Стан»—«Ясенева»—«Кажухоўская»—«Пячатнікі», а таксама «Краснадонская»—«Мар'іна».

**— Атрад ва ўсе гады выконваў работы па пракладцы не толькі новых станцый. У апошнія гады ў Мінску, акрамя метро, дзе яшчэ былі выкарыстаны яго моц і ўменні?**

— Напрыклад, у 2002 годзе атрад завяршыў будаўніцтва падземнага пераходу пад вуліцай Далгабродскай, таксама яго сіламі зроблены пешаходны пераход па праспекце Пераможцаў, у складзе комплексу «Мінск-Арэна». Займаліся мы ўмацаваннем катлавана пры ўзвядзенні гандлёвага цэнтра «Сталіца». Наш калектыў выконваў комплекс работ па добраўпарадкаванні тэрыторыі ў раёне вуліцы Далгабродскай, гасцініцы «Турыст» і ўнівермага «Беларусь». Мы таксама бралі ўдзел у работах на Аўгустоўскім канале, дзе працавалі над замацаваннем шлюза Дамброўка.

**— Як вы ацэніце тэмпы будаўніцтва метро ў Мінску ў параўнанні з іншымі краінамі?**

— Па колькасці і тэмпах адкрыцця станцый метрапалітэна мы апярэджваем нават Санкт-Пецярбург. А гэта паказальна — у савецкі час Ленінградскі метрапалітэн лічыўся лепшым у краіне, ён біў усе рэкорды па праходцы, выкарыстоўваў уласныя тэхналогіі. Улічваючы, што ўмовы для пракладкі станцый былі амаль ідэальнымі, быў час, калі ў Санкт-Пецярбургу раз у некалькі гадоў адкрывалі аднудзве новыя станцыі.

**— Ваш атрад лічыцца легендарным сярод метрабудаўцаў, і не толькі іх. Працавалі ў самых складаных месцах былога Савецкага Саюза. Давяраюць і давяралі самыя адказныя ўчасткі. Цяжкая гэта работа — будаваць метро?**

— Так, калектыў наш праваменрна заслугоўвае самай высокай пашаны. За прафесіяналізм, самаадданую працу ён не раз атрымліваў высокія дзяржаўныя ўзнагароды. Скажу шчыра — будаваць метро цяжка. Нашы работнікі маюць каласальны вопыт работы і на Каўказе, і ў Маскве, працуе ў нас шмат людзей, якія прыйшлі ў атрад у мінулым яшчэ з Данбаса. Яны і складаюць вельмі моцны касцяк усяго калектыву.

**— На юбілей што вы пажадаеце калектыву?**

— Новых работнікаў. Мы ахвотна запрашаем моладзь прыходзіць да нас у тунэльны атрад на працу.

Метро — гэта назаўжды, калі аднойчы звязаць з ім сваё жыццё, то не расстанешся ніколі. Галоўны інжынер Тунэльнага атрада № 1 Уладзімір МАМАЕЎ прыйшоў у атрад у 1970 годзе і так і застаўся ў ім. Прыехаў ён тады з Днепрапятроўска, і адразу ж трапіў на будаўніцтва Чыркейскай ГЭС. Адной з самых складных работ, як узгадвае Уладзімір Міхайлавіч, было ўзвядзенне вадаскідаў, якія праходзілі двума ярусамі. Спачатку трэба было пракласці верхні, забетанаваць яго, а потым прыступіць да праходжання ніжняга. Тунэлі ў скалах тады рабіліся выбуховым спосабам. Перш за ўсё свідравалі скалу, потым адбываўся выбух, і пры дапамозе моцнай машыны, якая выграбала сваімі лапамі скальную пароду, грунт вывозіўся на паверхню. Вось так і адточваўся вопыт, набываліся веды, а з імі прыйшла і адданасць да справы. Цяпер Уладзімір Міхайлавіч ведае пра пракладку і праходку тунэляў, новыя станцыі метро ўсё. За гады, што прайшлі, вопыт назапасіўся бясцэнны. І таксама, з вышыні свайго майстэрства, ведае і жадае ён, каб калектыў пастаянна аднаўляўся моладдзю:

— Мы маем уласны вучэбна-курсавы камбінат, на базе якога будучы работнік атрымлівае прафесію. Нават чалавек, які прыйшоў з вуліцы, ці адразу ж са школьнай лаўкі, можа авалодаць прафесіяй машыніста шчыта (шчыт — машына для праходкі тунэляў), праходчыка, мантажніка. Напрыклад, на праходчыка трэба вучыцца каля трох месяцаў, пры гэтым без адрыву ад вытворчасці. Спачатку можна ўладкавацца да нас падсобным рабочым, паралельна атрымліваць веды і навыкі, і потым пасля заканчэння навучання працаваць па выбранай прафесіі.













### НА ЗДЫМКАХ:

*1. Горны майстар Сяргей ПАРФЁНАЎ, праходчыкі Валерый ТРУСЕВІЧ і Іван КЛІНДЗЮК.*

*2. Начальнік Тунэльнага атрада № 1 Яўген ШУКАЕЎ.*

*3. Начальнік участка Раман ТУЗАЎ і галоўны інжынер Уладзімір МАМАЕЎ.*

*4. Брыгадзір праходчыкаў Аляксандр ЦУПРАНОВІЧ (у цэнтры) і яго надзейны калектыў.*

*5. Гідраізаляцыю сцяны праводзяць Генадзь ГЛІНСКІ і Генадзь ВОРАНАЎ.*

*6. Будаўніцтва тупікоў за станцыяй «Пятроўшчына».*

*7. Машыніст электравоза Валерый СЛОВАК вядомы не толькі як вопытны метрабудавец: калісьці ён паспяхова выступаў за футбольную каманду мінскага «Дынама».*

*8. Дакладнасць падземнага курсу шмат у чым залежыць ад маркшэйдара Святланы НАСАВЕЦ.*

***Матэрыял падрыхтавалі Дзмітрый АЛЬФЕР, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).***

УНП 100356531

---

Да Дня работнікаў радыё, тэлебачання і сувязі

# НАДЗЕЙНАЙ СУВЯЗІ!

## На лініі — «Белсувязьбуд»

**Разам з работнікамі радыё, тэлебачання і сувязі, якія 7 мая адзначаюць сваё прафесійнае свята, адзначаюць гэты дзень і работнікі акцыянернага таварыства «Белсувязьбуд». І, па сутнасці, з поўным на тое правам. Гэта ў першую чаргу іх заслуга ў тым, што мы маем сёння практычна па ўсёй рэспубліцы надзейную трывалую стацыянарную сувязь, «аблытаны» шчыльнай сеткай сотавай сувязі. Работнікі ААТ «Белсувязьбуд», вітаючы сваіх калег-сувязістаў з прафесійным святам, так і зазначаюць: «Бездакорнай, трывалай вам сувязі і ўдзячных кліентаў!»**

**Чым сёння з'яўляецца ААТ «Белсувязьбуд», якому, дарэчы, у наступным годзе спаўняецца 45 гадоў, чым канкрэтна займаюцца яго спецыялісты? Прычым тут жа асабліва падкрэслім: гэта менавіта спецыялісты — тут кожны трэці работнік мае вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю. А ўсіх у «Белсувязьбудзе» працуе каля 2 тысяч чалавек. Таварыства пры гэтым мае шырока разгалінаваную сетку філіялаў (усіх іх, разам з упраўленнем вытворча-тэхнічнай камплектацыі — 10), якія ахопліваюць сваёй дзейнасцю ўсю рэспубліку...**

У сферу дзейнасці «Белсувязьбуда» ўваходзяць праектаванне і будаўніцтва аўтаматычных тэлефонных станцый, сетак, сістэм і збудаванняў мясцовай тэлефоннай сувязі, а таксама радыёвяшчання, прыёмных сетак тэлебачання, дыспетчарскай сувязі і тэлеметрыі. Прадпрыемства таксама ўзводзіць сеткі і сістэмы міжгародняй і міжнароднай электрасувязі, сотавай тэлефоннай радыёсувязі і іншыя аб'екты.

У нярэдкіх выпадках спецыялісты «Белсувязьбуда» таксама выконваюць тэхнічнае абслугоўванне пракладзеных імі сетак і ўзведзеных аб'ектаў. Напрыклад, цяпер на абслугоўванні ў іх знаходзяцца многія лініі аператара сотавай сувязі «Velcom». У «Белсельбудзе» так гавораць: нашых сетак, нашай работы амаль не бачна, амаль уся гэта работа схавана пад зямлёй. А вось калі кліенты тэлефоннай сувязі не пачуюць адзін аднаго, тады могуць узгадаць і пра нас... Але такога, каб на выкананую спецыялістамі «Белсувязьбуда» работу былі нараканні, у ім не могуць і прыгадаць. Тут пры гэтым зазначаюць: «Якасць з'яўляецца вызначальным момантам ва ўсёй дзейнасці таварыства і яго развіцці».

І не проста зазначаюць. У мінулым годзе ў таварыстве ўкаранілі так званую інтэграваную сістэму кіравання, якая ўключае ў сябе сістэму менеджменту якасці, сістэму кіравання знешнім асяроддзем і сістэму аховы працы. Гэта інтэграваная сістэма сертыфікавана на яе адпаведнасць міжнародным стандартам СТБ/ИСО 9001—2005, СТБ/ИСО 14001—2005 і СТБ/ИСО 18001—2005. Можа, толькі на адзінкавых нашых прадпрыемствах ёсць такая ж сістэма. Яшчэ адзін цікавы факт: ААТ «Белсувязьбуд» паставіла перад сабой мэту дабіцца перамогі ў рэспубліканскім конкурсе на атрыманне прэміі Ўрада за дасягненні ў галіне якасці. І можна меркаваць, тут абавязкова даб'юцца гэтай мэты.

Звычайна не з'яўляюцца паказальнымі для «Белсувязьбуда» вынікі работы ў першым квартале. І, тым не меней, вынікі вельмі неблагія. За першы квартал ААТ увяло 5 аб'ектаў гарадскіх АТС агульнай ёмістасцю 27 916 нумароў, 12 аб'ектаў сельскіх тэлефонных станцый агульнай ёмістасцю 1774 нумары, адну кабельную лінію сувязі працягласцю каля 47 кіламетраў. Планавы аб'ём падрадных работ выкананы на 119 працэнтаў, рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі, работ і паслуг склала за першы квартал 16 працэнтаў. ААТ «Белсувязьбуд» з'яўляецца дамінуючым падрадчыкам Міністэрства сувязі — для яго арганізацый за першы квартал выканана больш за 70 працэнтаў агульнага аб'ёму работ таварыства.

Важкі ўклад у агульную справу робяць працаўнікі ўпраўлення вытворча-тэхнічнай камплектацыі (УВТК) — аднаго з падраздзяленняў «Белсувязьбуда», у якім мы пабывалі. Галоўны інжынер УВТК Павел Удовік расказаў: тут выпускаюць калодзежы кабельнай каналізацыі, кабелеўкладчыкі, нажы для пракладкі траншэй, усе элементы для мантажу мачтаў сотавай сувязі, поліэтыленавыя трубы, у якія хаваецца кабель, і іншую прадукцыю. «Многае з таго, чым камплектуюцца нашы аб'екты, а таксама механізмы і прыстасаванні для пракладкі ліній сувязі — уласнай вытворчасці. Гэта значна зніжае кошт выконваемых работ», — падкрэслівае Павел Удовік. А варта зазначыць, узводзімыя аб'екты дастаюцца «Белсувязьбуду» ў няпростай канкурэнтнай барацьбе, якая з цягам часу абяцае быць яшчэ больш вострай. Да гэтага ж часу ААТ у большасці выпадкаў выходзіла пераможцам адпаведных конкурсаў, і тут спадзяюцца захаваць гэту добрую тэндэнцыю і надалей.

Аб'екты сувязі нярэдка адносяць да аб'ектаў высокіх тэхналогій. І гэта цалкам апраўдана. Ужо тыя матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца пры ўзвядзенні ліній сувязі, — высокатэхналагічныя. Гэта, напрыклад, датычыцца валаконнааптычнага кабелю, які непараўнальна, у дзесяткі разоў, пашырае магчымасці перадачы сігналу. А лініі з такога кабелю займаюць цяпер у аб'ёмах «Белсувязьбуда» значную частку.

Варта тут жа назваць яшчэ адзін з накірункаў дзейнасці «Белсувязьбуда» — тэхнічнае пераўзбраенне дзеючых прадпрыемстваў сувязі, што дазваляе пашыраць іх функцыі і павышаць іх надзейнасць.

Незаўважная, а разам з тым вельмі нялёгкая работа ў калектыва «Белсувязьбуда». Каб пракласці той жа кабель ад кропкі «А» да кропкі «Б», трэба прайсці цяжкія кіламетры траншэй па бездарожжы, часам па камяністых глебах. Прайсці, не зважаючы на дажджы і слату, непагадзь... Самая магутная тэхніка выкарыстоўваецца на гэтых трасах, якая цягне за сабой кабелеўкладчыкі з вялізнымі бухтамі кабелю на іх. Часам у гэтыя кабелеўкладчыкі «запрагаецца» па тры і болей гусенічныя трактары адразу, злучаныя паміж сабой тоўстымі стальнымі тросамі. І тросы часам не вытрымліваюць... Тым не меней, сувязь паміж пунктамі «А» і «Б» павінна быць устаноўлена своечасова. Гэтага патрабуе заказчык, і гэтага правіла няўхільна прытрымліваецца калектыў.

За гады існавання «Белсувязьбуда» яго спецыялісты ўзвялі больш за 17 тысяч кіламетраў міжгародніх кабельных ліній сувязі, звыш 8 тысяч валаконна-аптычных ліній па тэхналогіях перадавых замежных фірмаў, увялі ў эксплуатацыю больш за 1300 аб'ектаў АТС агульнай ёмістасцю каля 2 мільёнаў 400 тысяч нумароў.

Працаўнікі «Белсувязьбуда» вельмі ганарацца такімі работамі, як стварэнне тэлекамунікацыйных сістэм для Нацыянальнай бібліятэкі, Палаца Рэспублікі, Чыгуначнага вакзала ў Мінску, для спартыўных комплексаў «Раўбічы» і «Сілічы», гандлёвага цэнтра «Сталіца», культурнага комплексу «Славянскі базар» і іншых аб'ектаў. Спецыялісты «Белсувязьбуда» праклалі тэхналагічную сувязь уздоўж аўтамагістралі «М-1. Брэст—Масква»; яны робяць свой немалы ўклад у агульную справу пры ўзвядзенні аграгарадкоў, пры рэканструкцыі плошчаў і вуліц сталіцы і іншых гарадоў рэспублікі, асабліва падчас іх падрыхтоўкі да правядзення рэспубліканскіх «Дажынак». Пры ўсім гэтым, як зразумела ўжо, асаблівы гонар калектыву складае менавіта надзейная бездакорная работа іх сістэм і ліній сувязі, іншых аб'ектаў у эксплуатацыйнікаў.

— Так і павінна быць, — падкрэслівае генеральны дырэктар ААТ «Белсувязьбуд» Мікалай Крукоўскі. — Надзейная работа сувязі — гэта галоўны паказчык усёй нашай працы. Адпаведна, напярэдадні Дня прафесійнага свята работнікаў гэтай галіны хочацца пажадаць ім працаваць, не дапускаючы ніякіх збояў у сувязі. Са святам!

**Іван БАРАНОЎСКІ.**



**НА ЗДЫМКУ: галоўны інжынер УВТК «Белсувязьбуда» Павел УДОВІК паказвае секцыі мачтаў для антэн сотавай сувязі.**

**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

УНП 100028969

---

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.29 | 20.45 | 15.16 |
| Віцебск — | 5.14 | 20.39 | 15.25 |
| Магілёў — | 5.19 | 20.35 | 15.16 |
| Гомель — | 5.21 | 20.26 | 15.05 |
| Гродна — | 5.45 | 20.59 | 15.14 |
| Брэст — | 5.51 | 20.54 | 15.03 |

### Месяц

***Апошняя квадра 28 красавіка—4 мая. Месяц у сузор'і Авена.***

### Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Гаўрылы, Рыгора, Фёдара.*

**К.** *Антаніны, Марыі, Ніны, Аляксандра, Пятра, Святаслава, Філіпа, Якуба.*

## НАДВОР'Е на заўтра

| Горад | Ціск | Ноччу | Днём |
|---|---|---|---|
| ВІЦЕБСК | 753мм рт.сл. | +8..+10°С | +19..+21°С |
| ГРОДНА | 753мм рт.сл. | +9..+11°С | +15..+17°С |
| МІНСК | 747мм рт.сл. | +9..+11°С | +17..+19°С |
| МАГІЛЁЎ | 751мм рт.сл. | +8..+10°С | +16..+18°С |
| БРЭСТ | 751мм рт.сл. | +9..+11°С | +17..+19°С |
| ГОМЕЛЬ | 756мм рт.сл. | +9..+11°С | +17..+19°С |

**Геамагнітныя ўзрушэнні**

23 гадз., 02 гадз., 05 гадз., 08 гадз., 11 гадз., 14 гадз., 17 гадз., 20 гадз.

**Абазначэнні:**
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура

### ...у суседзяў

| | |
|---|---|
| ВАРШАВА | +11..+13°С |
| ВІЛЬНЮС | +17..+19°С |
| КІЕЎ | +15..+17°С |
| МАСКВА | +20..+22°С |
| РЫГА | +19..+21°С |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | +20..+22°С |

## Дзве даты — 3 мая

**Сёння — Сусветны дзень свабоды друку, які праводзіцца штогод, пачынаючы з 1991 года па ініцыятыве Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА, падтрыманай Генеральнай Асамблеяй ААН.**



**1791 год** — Вялікі сейм Рэчы Паспалітай прыняў канстытуцыю, закліканую спрыяць палітычнаму і эканамічнаму развіццю краіны. Яна прадугледжвала, што кіруючыя органы дзяржавы будуць складацца напалову з прадстаўнікоў польскіх зямель, напалову — з зямель Вялікага княства Літоўскага. Гэта была першая канстытуцыя ў Еўропе, другая ў свеце (пасля ЗША).

**1771 год** — у Гродне нарадзіўся Аўгуст Бекю, беларускі ўрач, доктар філасофіі і медыцыны, прафесар. Адным з першых у Беларусі і Літве пачаў вакцынацыю супраць воспы. Аўтар шматлікіх навуковых прац. Загінуў у 1824 годзе ад удару маланкі.

## Цытата дня:

***«З каханнем справы абстаяць гэтак жа, як і з маслам: крыху холаду, і яно даўжэй застаецца свежым».***

**Марсель Ашар (1899—1974), французскі драматург.**

---

Крымінал

## Няпрошаныя рыэлтары

**Двое жыхароў Маладзечна вырашылі палепшыць свае жыллёвыя ўмовы з дапамогай кулакоў.**

Паводле звестак упраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкама, нахабнікі сярод ночы завіталі да сваёй знаёмай і прапанавалі зрабіць абмен кватэрамі. Выкарыстоўваючы ў якасці асноўных аргументаў кулакі, яны настойліва рэкамендавалі гаспадыні трохпакаёўкі коштам больш за 130 мільёнаў рублёў перасяліцца ў іх аднапакаёўку коштам 69 мільёнаў рублёў. Міліцыя затрымала няпрошаных «рыэлтараў» і ўзбудзіла крымінальную справу за вымаганне. Па ўсім відаць, казённым жыллём яны будуць забяспечаны. Адпаведным артыкулам Крымінальнага кодэкса за такое злачынства прадугледжана ад 5 да 13 гадоў пазбаўлення волі.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## Усміхнёмся!

Жонка, паглядзеўшы часопіс мод, кажа мужу:

— Сёлета мужчыны будуць насіць кашулі без гузікаў.

— Так? Значыць, я ўжо 15 гадоў модна апранаюся.

☺

За што не люблю вегетарыянцаў, дык гэта за тое, што яны ядуць ежу маёй ежы.

☺

— Дарагі, я вырашыла пайсці ў манастыр.

— Нішто сабе! Гэта што ж мне зараз, у манастыр на абед ездзіць?!

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.840. Індэкс 63850. Зак. № 2359. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12